МОСКВА 19
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИН.ТУТ
СОВ.СТРОИТ.И ПРАВА
12 ЗВ 2

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 133 (5807) | 11 чэрвеня 1937 г., пятніца | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

АДКРЫЎСЯ XVI З'ЕЗД КП(б)Б

У залі пасяджэнняў XVI з'езда КП(б)Б. Фото Я. Салавейчыка.

АВАНГАРД РЭСПУБЛІКІ

Учора адкрыўся XVI з'езд комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі. Лепшыя людзі рэспублікі, тыя, хто цяжар барацьбы вынес на сваіх плячах, тыя, хто высока трымаў непераможны сцяг Маркса — Энгельса — Леніна—Сталіна, мабілізуючы масы на перамогу соцыялізма, — сабраліся ў Дом урада, каб намеціць, на аснове ўказанняў таварыша Сталіна, праграму далейшай барацьбы за лепшую будучыню чалавецтва, за ўмацаванне рэспублікі, за комунізм.

Многа промахаў і памылак зрабіла КП(б)Б. Але не толькі памылкі і промахі ў балансе КП(б)Б. Праца, затрачаная перадавым атрадам рэспублікі—КП(б)Б, перадавымі рабочымі і сялянамі, не прапала дарма. Яна ўваплацілася ў жалеза і бетон, у машыны, тавары і пладародныя палі.

Рэспубліка стала індустрыяльна-аграрнай. Рэспубліка стала соцыялістычнай. Эксплаататарскія класы ў БССР ліквідаваны. Кулак-павук не п'е цяпер больш крыві з працоўных сялян. Прыгнечаныя ў дарэволюцыйным мінулым, сяляне цяпер ствараюць новае калгаснае жыццё. Жыццё радаснае і заможнае сёння і яшчэ больш шчаслівае заўтра.

Мацнее рэспубліка. Мацнее кіруючая сіла рэспублікі — КП(б)Б. Наша партыя, як ніколі, згуртавана вакол сталінскага ЦК ВКП(б) і вялікага друга народаў таварыша Сталіна. Сягоння, калі падводзіцца вынік пройдзенага шляху, сваё слова ўдзячнасці КП(б)Б ад імя рабочых і сялян Беларусі нясе таму, хто дапамагаў БССР, — рускаму пролетарыяту і, перш за ўсё, — натхніцелю сусветна-гістарычных перамог, вялікаму і мудраму Сталіну.

Дэлегаты з'езда сабраліся, каб крытычна ацаніць работу ЦК КП(б)Б і ўсёй партыйнай арганізацыі. Сягоння сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч зробіць справаздачны даклад аб рабоце ЦК КП(б)Б. Сягоння пачнуцца спрэчкі па справаздачнаму дакладу.

Жорсткі ўрок атрымала КП(б)Б. Бясклопатнасць і забыццё капіталістычнага акружэння ў практычнай рабоце абышліся нам вельмі дорага. Дэзертыр Чырвонай Арміі, двурушнік Хадасевіч, подлыя бандыты Убарэвіч, Дзякаў і Бенек праніклі ў самы вышэйшы і аўтарытэтны орган рэспублікі—ЦК КП(б)Б і яго бюро. Яны скарысталі гэтыя ўстановы, каб пакасціць нам, каб аслабляць магутнасць рэспублікі і ўчыніць пакуты гераічнаму народу. Па заданню сваіх гаспадароў—контрразведак замежных дзяржаў — подлая банда знішчала жывёлагадоўлю, раскрадала калгасную маемасць, арганізоўвала падпалы, ламала станкі. Яны не спыняліся і перад тым, каб адабраць самае дарагое ў чалавека — жыццё. У многіх машынна-трактарных станцыях яны арганізоўвалі пажары з чалавечымі афярамі.

Большэвікі Беларусі ўлічаць з гэтага факта ўсе ўрокі. Яны зробяць усё, каб падобныя ганебныя факты больш не паўтараліся.

Бясклопатнасці і ратазейству не павінна быць месца ў КП(б)Б, працуючай на граніцы з фашысцкімі дзяржавамі. Подступы да партыі для малодчыкаў з варожага лагера павінны быць і будуць замкнёны моцным замком. Ключ да гэтага даў вялікі Сталін. Авалодаць большэвізмам павінны комуністы БССР, каб не дапускаць трацкісцкіх, бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў у партыю, каб умець распазнаваць ворага, каб перамагчы бясклопатнасць, ратазейства і дабрадушнасць, якія моцна ўкараніліся ў КП(б)Б.

Дзёрзасць і пакасць ворага не астануцца беспакаранымі. За шкодніцтва, дыверсіі, шпіянаж, тэрор, за жыццё нашых людзей подлыя трацкісцкія, бухарынскія, нацыянал-фашысцкія і іншыя тэрарысты, шпіёны, дыверсанты, шкоднікі расплоцяцца пудамі сваёй подлай, смярдзючай крыві.

КП(б)Б моцна звязана з народам, насяляючым БССР. Сілы КП(б)Б ў яе большэвіцкіх прынцыпах работы, здольнасці чэсна і да канца ўскрываць свае памылкі і промахі, прадумваць іх карэнні і прычыны, расказаць аб іх масам. Справаздачна-выбарчыя сходы былі дэманстрацыяй гэтае сілы. Комуністы на гэтых сходах з небывалай актыўнасцю і страснасцю ўскрывалі парокі работы і гарэлі жаданнем быстра і да канца іх перамагчы. І гэта з'яўляецца гарантыяй таго, што памылкі і промахі ў партыйна-палітычнай рабоце будуць быстра зжыты.

БССР — крэпасць СССР на захадзе. Сіла наша — у непарушнай дружбе працоўных з Чырвонай Арміяй і слаўнымі пагранічнікамі. Гэта дружба — закон жыцця беларускага народу, і парушыць яго нікому не ўдасца. Тысячы праклёнаў працоўныя БССР абрушаць сёння на галавы подлых шпіёнаў і здраднікаў радзімы — Гамарніка, Тухачэўскага, Якіра, Убарэвіча, Корка, Эйдэмана, Фельдмана, Прымакова і Путна, якія прабавалі звіць бандыцкае гняздо ў Чырвонай Арміі. Яшчэ больш умацуюць працоўныя сваю сувязь з Чырвонай Арміяй, каб аб'яднанымі намаганнямі ўзняць абаронную магутнасць краіны соцыялізма і пільней ахоўваць граніцы магутнай дзяржавы.

Няхай вораг не спадзяецца на лёгкасць перамогі. Краіна наша магутна як ніколі. Рабочыя і сяляне, як ніколі, згуртваны і аб'яднаны вакол комуністычнай партыі і совецкага ўрада. І калі вораг паспрабуе выпрабаваць нашу моц, дык няхай не крыўдзіцца на нас. Грознай лавінай, магутнай сілай гераічная, слаўная Чырвоная Армія разам з рабочымі і сялянамі ярасна абрушацца на ворага, абараняючы сваю маці-радзіму—СССР.

Урокі, атрыманыя краінай, многаму вучаць і патрабуюць ад нас таго, каб партыя калёным жалезам выпальвала бясклопатнасць і дабрадушнасць. Няма сумнення, што з'езд КП(б)Б узніме яшчэ вышэй большэвіцкую пільнасць і барацьбу з бясклопатнасцю і групоўшчынай, якія яшчэ не выкаранены ў КП(б)Б.

Сягоння, калі пачаў сваю работу з'езд КП(б)Б, працоўныя пагранічных раёнаў рэспублікі і слаўныя пагранічнікі яшчэ мацней зачыняць граніцы Совецкага Саюза, каб не даць магчымасці ніводнаму шпіёну пранікнуць на тэрыторыю магутнай пролетарскай дзяржавы.

Сёння, калі пачаў сваю работу з'езд КП(б)Б, працоўныя БССР яшчэ вышэй падымуць сцяг соцыялістычнага спаборніцтва і зробяць усё, каб машыны совецкіх заводаў далі больш прадукцыі, а совецкія палі — багаты ўраджай.

КІРУЮЧЫЯ ОРГАНЫ XVI З'ЕЗДА КП(б)Б

ГАНАРОВЫ ПРЭЗІДЫУМ

Сталін, Андрэеў, Ежоў
Молатаў, Мікаян, Дзімітраў
Кагановіч, Чубар, Тэльман
Варашылаў, Касіор, Хозе Дыяс
Калінін, Жданаў

ПРЭЗІДЫУМ

ШАРАНГОВІЧ, ЖУРАУЛЕЎ, ЛІТВІН
ВАЛКОВІЧ, СТАКУН, КЛІМЧУК
БЕРМАН, РУБІНШТЭЙН, ДОСІН
БЯЛОЎ, АНАНЬЕЎ, АУГУСТАЙЦІС
МЕЗІС, ЧАРНЫШОЎ, ЗАПОЛЬСКІ
ШУСЦІН, КАМЕНШТЭЙН, ЮНГ
ЦІХОН, АРМАН, ПАГОДЗІН
ЧАРВЯКОЎ, ВАРОНЧАНКА

САКРАТАРЫЯТ

СОСКІН, ЛАБАДАЕЎ, КЕЧКІН
ЛІХАЧОЎ, ВАЙНОВІЧ, ПАТАПЕЙКА
ГОТФРЫД, ЛІСКОВІЧ, СУРТА.
ЮРКОЎ

МАНДАТНАЯ КАМІСІЯ

ВАЙНМАН, БАЛЫЧЭНКА, НІЗОЎЦАЎ
ЛЯХАЎ, МАЙСЕЕЎ, ШАХАЎ
КАВАЛЁЎ, КАЛЬЦОЎ, ВАЛЬФСОН
КУДЗЕЛЬСКІ, СЫЧОЎ, МАР'ЯНОЎ.

Уступная прамова тав. ШАРАНГОВІЧА

Таварышы, XVI з'езд комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі адкрываецца ў вельмі адказны перыяд для нашай краіны. З'езд адкрываецца пасля ўвядзення Сталінскай Канстытуцыі, якая знамянуе паварот у палітычным жыцці нашай краіны.

XVI з'езд КП(б)Б адкрываецца пасля гістарычнага Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б), пасля гістарычнага даклада і заключнага слова таварыша Сталіна, які ўзброіў нашу партыю, нашу краіну, у тым ліку і КП(б)Б і ўвесь беларускі народ для барацьбы за новыя перамогі і новыя поспехі, для барацьбы за соцыялізм, для барацьбы з ворагамі.

XVI з'езд комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі адкрываецца ў момант, калі пераможна выкананы па валавой прадукцыі план другой пяцігодкі і ўжо складаецца план трэцяй пяцігодкі, на выкананне якой мы павінны аддаць усе нашы сілы, усю нашу энергію і мабілізаваць многамільённы наш народ.

Таварышы, мы павінны памятаць і ні на мінуту не забываць папярэджання таварыша Сталіна аб тым, што мы знаходзімся і працуем у капіталістычным акружэнні, памятаць аб падрыўной рабоце трацкістаў, правых, нацыяналістаў, гэтых японска-германскіх і польскіх агентаў, бандытаў, дыверсантаў, шпіёнаў і шкоднікаў, гэтай фашысцкай нечысці. Фашызм рыхтуе ўзмоцненымі тэмпамі вайну супроць нас і гэта асабліва трэба памятаць нам, большэвікам і ўсяму беларускаму народу, працуючым на граніцы з фашысцкай Польшчай.

Таварышы, БССР у брацкім саюзе і дружбе з усімі народамі вялікага Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік дабілася велізарных поспехаў на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва, поспехаў у ажыццяўленні ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, поспехаў, запісаных у новую, прынятую намі Канстытуцыю БССР, пабудаваную на прынцыпах Сталінскай Канстытуцыі.

Комуністычная партыя большэвікоў з'яўляецца кіруючай сілай усяго соцыялістычнага будаўніцтва Беларусі. Комуністычная партыя большэвікоў Беларусі прышла да свайго XVI з'езда як ніколі згуртаваная вакол ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай комуністычнай партыі большэвікоў, вакол нашага дарагога вялікага настаўніка і правадыра таварыша Сталіна. **(Бурныя апладысменты ў гонар таварыша Сталіна. Усе ўстаюць, апладысменты пераходзяць у авацыю).**

Гэта з усёй яснасцю пацвердзілі справаздачна-выбарчыя сходы пярвічных парторганізацый. Гэта, несумненна, з яшчэ большай яснасцю пацвердзіць наш XVI з'езд комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі.

Таварышы, тыя недахопы і памылкі ў пастаноўцы партыйна-палітычнай работы, якія ўскрыў таварыш Сталін на Лютаўскім Пленуме Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай комуністычнай партыі большэвікоў, цалкам і поўнасцю мелі месца і ў нас у КП(б)Б.

Мы павінны перабудаваць сваю работу, каб яна была на ўзроўні задач, ныктуемых паваротам у палітычным жыцці краіны ў сувязі з увядзеннем новай Сталінскай Канстытуцыі.

Таварышы, мы павінны ўзняць большэвіцкую пільнасць. Усе факты паказваюць, што яна ў КП(б)Б не была на належнай вышыні, інакш нічым іншым нельга вытлумачыць таго, што не гледзячы на сігналы, аставаліся нявыкрытымі дэзертыр Чырвонай Арміі, двурушнік Хадасевіч і такія маперыя ворагі народу, як Бенек, Дзякаў і цэлы рад іншых прэзрэнных здраднікаў нашай радзімы.

Мы павінны знішчыць да канца астаткі японска-нямецкіх і польскіх шпіёнаў і дыверсантаў, астаткі трацкісцка-бухарынскай і нацыяналістычнай падлы, раздавіць і спёрці іх у парашок, як-бы яны ні маскіраваліся, у якую-б шчыліну ні схаваліся.

Мы павінны сказаць на нашым з'ездзе адно: **смерць гэтым гадам і здраднікам нашай радзімы!**

Мы павінны падняць яшчэ вышэй ідэйна-палітычную работу сярод комуністаў і беспартыйных рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі, сярод усіх працоўных. Мы павінны яшчэ больш узмацніць узбраенне мас вучэннем Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна.

Няма такой сілы, якая-б прыпыніла пераможнае шэсце рабочага класа да комунізма. Я думаю, што выкажу думку ўсіх дэлегатаў нашага з'езда, калі скажу, што ўся комуністычная партыя большэвікоў Беларусі аддасць усе свае сілы без астатка на службу справе партыі Леніна—Сталіна **(апладысменты)**, яшчэ больш умацуе сувязь з масамі і мабілізуе іх на барацьбу за новыя перамогі комунізма.

Таварышы, я заклікаю дэлегатаў з'езда падвергнуць большэвіцкай крытыцы і самакрытыцы ўсе нашы памылкі, недахопы і ў першую чаргу памылкі, недахопы ЦК КП(б)Б, кіруючыся ўказаннямі таварыша Сталіна.

Няхай жыве наша вялікая магутная партыя!

Няхай жыве ленінска-сталінскі Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай комуністычнай партыі!

Няхай жыве дарагі наш правадыр і настаўнік таварыш Сталін! **(Бурныя апладысменты, воклічы «ура таварышу Сталіну», усе ўстаюць).**

Тав. Шаранговіч абвяшчае XVI з'езд КП(б)Б адкрытым.

ПЕРШЫ ДЗЕНЬ РАБОТЫ З'ЕЗДА

Роўна 6 гадзін вечара. Вялікая зала Дома ўрада — зала пасяджэнняў XVI з'езда КП(б)Б — поўная.

Лепшыя сыны КП(б)Б, загартаваныя ў барацьбе за перамогу вялікай справы Леніна—Сталіна, большэвіцкія кадры сабраліся тут. Лепшыя з лепшых, тыя, каму партыйныя масы аказалі вялікае давер'е, выбраўшы іх на з'езд, запоўнілі сёння вялікую залу. Гэтыя людзі прайшлі вялікую праверку знізу — на сходах пярвічных партарганізацый, на раённых, гарадскіх і акруговых канферэнцыях правяралі іх партыйныя масы. Узброеныя гістарычнымі рашэннямі Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б), дакладам і заключнай прамовай таварыша Сталіна на Пленуме, яны прышлі на з'езд палітычна вырасшымі, яшчэ пясней згуртаванымі вакол сталінскага ЦК ВКП(б) і свайго любімага правадыра — вялікага Сталіна.

Тут кіраўнікі КП(б)Б, партыйныя работнікі, большавікі-стахановцы — тыя, хто непасрэдна ля станка з гонарам носяць высокае званне члена партыі, хто паказвае прыклад высокапрадукцыйнай працы і вядзе за сабой шырокія масы беспартыйных рабочых і работніц. Тут і комуністы-калгаснікі, кіраўнікі калгасаў арэнаснай БССР, камандзіры і палітработнікі Чырвонай Арміі, слаўныя пагранічнікі, гаспадарнікі і работнікі навукі і культуры — кадры, вырашчаныя большэвіцкай партыяй, выпеставаныя вялікім Сталіным. На грудзях многіх дэлегатаў зяяюць ордэны Саюза — адзнака вышэйшай узнагароды, адзнака вялікіх гераічных спраў за славу совецкай радзімы, за яе магутнасць і непрыступнасць.

Сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч на ўступнай прамове гаворыць аб любві большэвікоў Беларусі да любімага тварца, арганізатара і кіраўніка КП(б)Б і БССР—да роднага Сталіна.

— Няма такой сілы, — гаворыць тав. Шаранговіч, — якая-б прыпыніла пераможны ход рабочага класа да комунізма. Я думаю, што выкажу думку ўсіх дэлегатаў нашага з'езда, калі скажу, што ўся комуністычная партыя большэвікоў Беларусі аддасць усе свае сілы на службу справе партыі Леніна—Сталіна.

Яго апошнія словы заглушаюцца выбухам авацый і воклічаў «ура». З'езд стоячы вітае любімага правадыра народаў вялікага Сталіна.

— Няхай жыве наш правадыр і настаўнік — родны Сталін!

Грамавое «ўра» патрасае скляпенні вялікай залы.

Тав. Шаранговіч указвае, што большавікі Беларусі павінны памятаць і ні на хвіліну не забываць аб капіталістычным акружэнні, памятаць аб падрыўной рабоце трацкісцкіх, правых і нацыяналістычных шпіёнаў, дыверсантаў і забойцаў. Ён заклікае вышэй узняць рэволюцыйную пільнасць, бязлітасна змагацца з ворагам.

— Мы павінны ўзняць большэвіцкую пільнасць. Усе факты паказваюць, што яна ў КП(б)Б не была на належнай вышыні. Інакш нічым іншым нельга растлумачыць таго, што, не гледзячы на сігналы, аставаліся нявыкрытымі дэзертыр Чырвонай Арміі і двурушнік Хадасевіч, такія маперыя ворагі народу, як Бенек, Дзякаў і цэлы рад іншых агідных здраднікаў нашай радзіме.

— Мы павінны сказаць на нашым з'ездзе адно: **Смерць гэтым гадам і здраднікам нашай радзіме!**

— Тазарышы, — зварачаецца да дэлегатаў тав. Шаранговіч, — з выбраных на XVI з'езд КП(б)Б 709 дэлегатаў з рашаючым і 157 з дарадчым голасам з'явілася 666 дэлегатаў з правам рашаючага голасу і 146 з дарадчым; такім чынам, з'езд з'яўляецца правамоцным. XVI з'езд КП(б)Б лічу адкрытым.

З'езд выбірае Прэзідыум у складзе 23 чалавек, Сакратарыят у складзе 10 чалавек і Мандатную камісію з 12 чалавек.

Слова прадастаўляецца сакратару Гомельскага гаркома КП(б)Б тав. Стакуну.

— Прапаную выбраць ганаровы прэзідыум XVI з'езда КП(б)Б.

— Таварыш Сталін!

У адзіным парыве, захопленыя глыбокаю, бязмежнаю любоўю да вялікага Сталіна, палымяюцца са сваіх месц дэлегаты. Грымяць авацыі. З усіх куткоў залы нясецца магутны кліч «Няхай жыве таварыш Сталін». Гучнае «ўра» перакатваецца з канца ў канец залы. Большэвікі Беларусі бурна вітаюць таго, хто вядзе вялікую Краіну соцыялізма ад перамогі да перамогі.

Бурнымі воплескамі сустракаюць дэлегаты імёны саратнікаў вялікага Сталіна.

— Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Андрэеў, Мікаян, Чубар, Касіор, Жданаў, Ежоў.

Пад бурныя воплескі ў ганаровы прэзідыум з'езда выбіраюцца таварышы: Дзімітраў, Тэльман, Хозе Дыяс.

З'езд зацвярджае наступны парадак дня:

Справаздача ЦК КП(б)Б.
Справаздача Рэвізійнай камісіі ЦК КП(б)Б.
Выбары ЦК КП(б)Б.
Выбары Рэвізійнай камісіі ЦК КП(б)Б.

Пасля зацвярджэння парадку работы з'езда вячэрняе пасяджэнне закрываецца.

Сягоння з'езд пачынае работу ў 11 гадзін раніцы.

ДЭЛЕГАТЫ XVI З'ЕЗДА КП(б)Б ПРЫСУТНІЧАЛІ НА ОПЕРЫ „ФЛОРЫЯ ТОСКА"

Учора вечарам дэлегаты XVI з'езда комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі прысутнічалі на пастаноўцы оперы італьянскага кампазітара Д. Пучыні «Флорыя Тоска» ў Беларускім Дзяржаўным тэатры оперы і балета.

Напісаная яшчэ ў 1900 годзе, опера не згубіла сваёй музыкальнай каштоўнасці і не дрэнна прагучэла зараз на беларускай мове ў нашым Тэатры оперы і балета. Дэлегаты з'езда асталіся задаволенымі работаю тэатра па скарыстанню класічнай спадчыны і апладысментамі віталі лепшых акцёраў.

СТАРЫ ЛОЗУНГ АБ АВАЛОДАННІ ТЭХНІКАЙ НЕАБХОДНА ЦЯПЕР ДАПОЎНІЦЬ НОВЫМ ЛОЗУНГАМ АБ АВАЛОДАННІ БОЛЬШЭВІЗМАМ *(І. СТАЛІН)*

ЗМЕСТ ПРАПАГАНДЫ—ГАЛОЎНАЕ ПЫТАННЕ

У сваім пісьме ўкладальнікам падручніка гісторыі ВКП(б) таварыш Сталін указаў: «Я думаю, што нашы падручнікі па гісторыі ВКП(б) нездавальняючыя па трох галоўных прычынах. Нездавальняючыя або таму, што яны выкладаюць гісторыю ВКП(б) па-за сувязяю з гісторыяй краіны; або таму, што абмяжоўваюцца расказам, простым апісаннем падзей і фактаў барацьбы плыняў, не даючы неабходнага марксісцкага тлумачэння; або-ж таму, што маюць няправільнасць канструкцыі, няправільнасць перыядызацыі падзей».

Гэтыя недахопы характэрны не толькі для падручнікаў. Яны характэрны для ўсіх нашых школ і гурткоў, для ўсёй сеткі партыйнай асветы.

У радзе гурткоў і школ партыйнай асветы барацьба партыі, яе тактыка, стратэгія, асобныя падзеі і факты не глыбока ўсвойваліся, прычым падзеі і факты, тактыка і стратэгія разглядаліся па-за сувязяю з агульнагістарычнай абстаноўкай.

Большасць гурткоў па вывучэнню гісторыі партыі ў часе заняткаў не высвятлялі прынцыповы характар барацьбы з антыбольшэвіцкімі плынямі і фракцыямі, не высвятлялі немінучасць гэтай барацьбы ва ўмовах капіталізма, ва ўмовах наяўнасці антаганістычных класаў.

Такое становішча спраў наруку ворагам партыі і народу — трацкістам, бухарынцам, нацдэмам усіх колераў.

У гуртку па вывучэнню гісторыі партыі партарганізацыі Наркаммясцпрома пры вывучэнні матэрыялаў XIV з'езда прапагандыст тав. Урыс пачаў заняткі з пастаноўкі слухачам пытанняў. Пытанні, як і адказы, былі далёка некваліфікаванымі і непрадуманымі. Большасць слухачоў вельмі блытана асвятляла факты і падзеі перыяда XIV з'езда. У заключэнне прапагандыст тав. Урыс не змог ускрыць памылак і недакладнасцей асобных слухачоў. Унутраная і міжнародная абстаноўка, у якой Зіноўеў і Каменеў разгарнулі барацьбу супроць партыі большэвікоў, ленінізма і ленінскага ЦК партыі напярэдадні XVI з'езда, не была паказана.

Не была ўскрыта меншавіцка-трацкісцкая сутнасць «новай апазіцыі». Мімаходам было сказана аб паражэнні зіноўеўскай апазіцыі на XIV з'ездзе партыі. Не быў таксама дастаткова выкрыт бухарынскі лозунг «абагачайцеся». І самае сур'ёзнае гэта тое, што правыя рэстаўратары капіталізма не былі паказаны, як здраднікі радзімы, як агенты фашысцкіх контрразведак. У рэзультаце такой бязвубай падачы фактаў слухачы не атрымалі ўяўлення аб Каменеве і Зіноўеве, як аб агентах германскага гестапо, як аб главарах зграі шкоднікаў і тэрарыстаў.

У радзе гурткоў прапагандысты прыходзяць на заняткі зусім не падрыхтаванымі. У лепшым выпадку яны чытаюць з падручніка (прапагандыст Наркамзема т. Савостаў і т. д.). Дзе тут думаць аб змесце выкладання, аб засваяемасці слухачамі матэрыялаў. Такіх фактаў можна прывесці шмат.

Патрэбна сказаць, што ў большасці пры абмеркаванні пытанняў прапаганды закранаюцца пытанні арганізацыйных непадабаў таго ці іншага гуртка, школы, пытанні зместу партыйнай вучобы выпадаюць з поля зроку партыйных арганізацый. А змест прапаганды — галоўнае пытанне. Не паглыбляючыся ў сутнасць выкладання гісторыі партыі, пельга па-сапраўднаму арганізаваць барацьбу за авалоданне большэвізмам.

ЧАВУСКІ.

АБ ПАДБОРЫ ПРАПАГАНДЫСЦКІХ КАДРАЎ

Галоўным фактарам, калі не сказаць рашаючым, у справе павышэння якасці партыйнай прапаганды з'яўляецца прапагандыст. Ад яго падрыхтаванасці, ідэалагічнай устойлівасці ў першую чаргу залежыць узровень палітыка-выхаваўчай работы ў школах і гуртках, ідэйна вытрыманы змест выкладання і т. д.

Між тым у радзе партыйных арганізацый КП(б)Б спразе падбору прапагандыстаў не аддавалася належнай увагі. Да прапагандысцкай работы надзвычай слаба прыцягваліся кіруючыя работнікі партыйнага апарата — сакратары і члены бюро гаркомаў і райкомаў, сакратары парткомаў і парторгі. На самой справе, ці-ж можна лічыць нармальным такое становішча, калі з 2.508 прапагандыстаў толькі 578 з'яўляюцца кіруючымі партработнікамі? Ненармальнасць такога становішча будзе яшчэ больш відавочнай, калі ўлічыць, што колькасць прапагандыстаў-партработнікаў складае ўсяго 18 проц. да агульнага ліку кіруючага складу партапарата.

Некаторыя партарганізацыі скоротка паплаціліся за несур'ёзны падыход да падбору прапагандыстаў. Так, напрыклад, Менскаму гаркому КП(б)Б прышлося ў 1936 годзе выключыць з партыі 31 прапагандыста за прыналежнасць да контрреволюцыйнага трацкізма і працягванне трацкісцкай кантрабанды. Гомельскі гарком выключыў 12 чал., Магілеўскі—14.

У Узлянскім, Дзержынскім і Магілеўскім раёнах рад прапагандыстаў адхілены ад прапагандысцкай работы за грубейшыя палітычныя скажэнні пры выкладанні гісторыі ВКП(б).

Значная частка прапагандыстаў не мае належнай палітычнай падрыхтоўкі. З 2.508 прапагандыстаў 864 ніяе не вучыліся; 633 чал. скончылі кароткатэрміновыя курсы і толькі менш паловы таварышоў маюць палітычную адукацыю ў аб'ёме соўпартшколы і комвуза. Гэта ўскладае вялікую адказнасць на партыйныя арганізацыі. Прапагандыстам трэба стварыць усе ўмовы для таго, каб яны сістэматычна вучыліся, атрымлівалі высокакваліфікаваную кансультацыю.

Трэба ўрэшце пакончыць з пякучасцю прапагандысцкіх кадраў. Яны павінны быць замацаваны на сваёй рабоце, узнімаць сваю кваліфікацыю.

Райкомы нярэдка скардзяцца на недахоп прапагандыстаў, не заўважаючы, што імі не выкарыстоўваецца велізарная колькасць партработнікаў, якія могуць і павінны быць прыцягнуты для работы ў якасці прапагандыстаў. Іх непасрэдны ўдзел у прапагандысцкай рабоце ўзніме і арганізацыйную пастаноўку вучобы і якасць прапаганды.

Складам прапагандыстаў, іх падборам і вызучэннем партарганізацыі займаліся недастаткова, і ў гэтым трэба шукаць адну з прычын усё яшчэ слабай пастаноўкі партыйнай прапаганды. Адсюль зусім ясна вышэйшая важнейшая задача — лепшых людзей партыйнага апарата прыцягнуць да прапагандысцкай работы, сістэматычна займацца падборам і вырашчваннем кадраў прапагандыстаў.

СТОЛІН.

ПАРТЫЙНЫ ГАБІНЕТ ФАБРЫКІ „КОМУНАРКА“

Выпадковыя памяшканні, частыя перабоі ў занятках, адсутнасць сталай кваліфікаванай дапамогі,—вось умовы, у якіх зусім нядаўна прыходзілася працаваць прапагандыстам сеткі партыйнай асветы менскай фабрыкі «Комунарка».

Натуральна, гэтыя абставіны, якія шкодна адбіваліся на прапагандысцкай і агітацыйнай рабоце партыйнай арганізацыі фабрыкі, не маглі быць пярпімымі. Некалькі месяцаў назад партком рашыў зрабіць карэннае палепшанне ў справе марксісцка-ленінскага выхавання комуністаў, комсамольцаў і спачуваючых. І перш за ўсё ўвага парткома была накіравана на тое, каб перабудаваць работу партыйнага габінета. Зрабіць яго, сапраўдным цэнтрам усебаковай дапамогі актыву (прапагандыстам, агітатарам, парторгам),—такую задачу паставіў перад сабой партком.

Вось ужо больш 2 месяцаў, як партыйны габінет фабрыкі працуе ў добрым памяшканні. Што ўяўляе з сябе партгабінет фабрыкі?

Габінет мае 3 самастойныя, культурна абсталяваныя пакоі (пакой падрыхтоўкі да заняткаў, пакой для кансультацый, радыёаўдыторыю) і дадатковы пакой—бібліятэку (сумесна з фабкомам). Кожны з пакояў прыгожа абсталяван і мае ўтульны выгляд.

Габінет мае ўласны бібліятэчны фонд, які сістэматычна папаўняецца дадатковай літаратурай і навінкамі; сталую вітрыну «Канстытуцыя СССР»; магутны радыёпрыёмнік з гучнагаварыцелем; патэфон і адаптэр (прыстасаванне для перадачы з патэфона па радыё) з пласцінкамі прамоў Леніна, Кірава, Кагановіча і камплектам пласцінак даклада таварыша Сталіна і прамовы тав. Молатава аб Канстытуцыі СССР; аласкоп (праекцыйны ліхтар) з наборам адпаведных лент для гурткоў па вывучэнню гісторыі партыі і інш.

Такое абсталяванне і аснашчэнне габінета дае яму ўсе ўмовы для наладжвання неабходнай работы. Што-ж робіць габінет, які змест і напрамак яго работы?

Партгабінет перш за ўсё наладзіў сталую кансультацыю прапагандыстаў і слухачоў да заняткаў. У пэўна ўстаноўленыя гадзіны таксама працуе пакой падрыхтоўкі да заняткаў і бібліятэка. Па рашэнню парткома вызначаны сталыя дні (1, 5, 10, 16, 23 числа кожнага месяца) падрыхтоўкі да заняткаў. У гэтыя дні, як паказвае вопыт, наглядаецца найбольшая наведванне габінета слухачамі. Па іх водгуках сталыя дні падрыхтоўкі да заняткаў дысцыплінуюць, прывучаюць да глыбокай работы над матэрыялам.

У партгабінеце амаль заўсёды ёсць адпаведная літаратура да чарговых заняткаў (аб ёй слухачам вядома праз прапагандыстаў і кансультантаў і праз спецыяльныя абвесткі), а таксама, праўда ў абмежаванай колькасці, наглядныя дапаможнікі (карты, дыяграмы, фото і інш.).

Партгабінет практыкуе наладжванне слухання радыёлекцый па гісторыі партыі (калі яны супадаюць з прахадзімай праграмай). Між іншым, у гэтай рабоце бываюць такія казусы. Менская радыёстанцыя нярэдка трансліруе лекцыі з Масквы, адзін раз з папулярнага курса, а другі раз з павышанага, чым уносіць рознабой у слуханне. У такім становішчы габінет выручае ўласны прыёмнік, з дапамогай якога неабходныя лекцыі прымаюцца непасрэдна з Масквы.

У партгабінеце ў маі месяцы праведзена лекцыя аб міжнародным становішчы (да гэтай лекцыі была зроблена выстаўка адпаведных матэрыялаў) і лекцыя аб праблеме Вялікай Волгі (канал Волга—Масква). Рыхтуецца лекцыя аб Паўночным полюсе. У маі таксама праведзена лекцыя з аласкопам для гурткоў спачуваючых на тэму «У барацьбе з якімі ворагамі вырас большэвізм».

Лекцыі і гутаркі па бягучых пытаннях і праграмных матэрыялах выклікаюць вялікую зацікаўленасць слухачоў і прыносяць велізарную карысць у выхаваўчай рабоце. Незабыўнае ўражанне асталося ў слухачоў ад арганізаванай партгабінетам гутаркі старога большэвіка т. Шуспіна са спачуваючымі на тэму «Як партыя змагалася і змагаецца за чыстату сваіх радоў».

Азнаямленне з работай гурткоў, асобных прапагандыстаў і агітатараў дае падставу сцвярджаць, што партгабінет фабрыкі паступова заваёўвае належачую яму папулярнасць. Габінет становіцца неабходным звяном той прапагандысцкай і агітацыйнай работы, якую праводзіць партыйная арганізацыя фабрыкі. Габінетам загадвае кваліфікаваны і ініцыятыўны работнік т. Ашаровіч. Партком (сакратар т. Рабкін) удзяляе вялікую ўвагу рабоце габінета. Аднак для таго, каб габінет стаў сапраўдным прапагандысцкім цэнтрам, зроблена далёка не ўсё.

Няма неабходнасці даказваць, што прапагандысты і агітатары фабрыкі адчуваюць вострую патрэбу ва ўсебаковай індывідуальнай дапамозе. Не сакрэт, што самым слабым месцам у рабоце гурткоў па вывучэнню гісторыі партыі з'яўляецца дрэннае веданне самімі прапагандыстамі жывой гісторыі барацьбы партыі, яе герояў і кіраўнікоў, дрэннае веданне эканамічнай і палітычнай абстаноўкі, у якой адбывалася гэта барацьба. Прапагандысты т. Новікаў і т. Флендэр шчыра прызнаюцца, што яны яшчэ не маюць магчымасці практычна ажыццяўляць указанні таварыша Сталіна аб вывучэнні гісторыі ВКП(б), бо не адчуваюць у гэтым канкрэтнай дапамогі. Гэты буйнейшы недахоп работы прапагандыстаў сказваецца і на якасці работы гурткоў. Зусім зразумела, што ў павышэнні ідэйнага ўзроўню палітвучобы рашаючую ролю павінен адыграць партгабінет.

Галоўная задача, асноўны змест работы габінета—арганізацыя індывідуальнай дапамогі прапагандыстам, агітатарам і парторгам. Гэта работа надзвычайна складаная, карпатлівая. Між тым, загадчык партгабінета нярэдка займаецца выканаўнем функцый парткома: падрыхтоўка да сходаў, выклік дакладчыкаў, клопаты аб іх і т. д. Гэта не дае магчымасці загадчыку габінетам займацца сваёй непасрэднай работай (індывідуальная кансультацыя, асабістая падрыхтоўка да чарговай кансультацыі, арганізацыя ўнутранай работы ў габінеце і т. д.). Адцягненне ўвагі партгабінета ад агульна-арганізацыйнай работы парткома можа прывесці да таго, што сродкі, затрачаныя на абсталяванне і аснашчэнне габінета і работа, праваднімая ім, пойдуць на змарку, а габінет ператворыцца ў прыгожую выстаўку або музей.

Можа атрымацца і другі малюнак.

Зусім нядаўна партком даручыў загадчыку партгабінета падрыхтоўку агульна-фабрычнай масоўкі. Даручэнне выканана. Днямі партком даручыў загадчыку партгабінета планіроўку фабрычнага парка і разгортванне ў ім культработы. Зусім зразумела, што ператварэнне загадчыка партгабінетам у своеасаблівага культработніка можа прывесці да таго, што габінет стане чырвоным кутком фабрыкі і страціць сваё значэнне.

Партгабінет фабрыкі «Комунарка»—надзвычай каштоўная ўстанова. Вядома, у яго рабоце побач з дадатнымі бакамі ёсць нямала і недахопаў. Яму патрэбна дабіцца пэўнай планавасці ў сваёй рабоце, асабліва ў справе арганізацыі кансультацый, экскурсій, распраноўкі ў дапамогу партвучобе мясцовых матэрыялаў, уцягненне ў работу габінета культурных сіл горада. Габінету таксама трэба рэзка палепшыць абслугоўванне агітатараў (уважлівы падбор у спецыяльных папках газетных выразак па актуальных палітычных пытаннях і бягучаму моманту, арганізацыя даведачнай работы, забеспячэнне наглядными дапаможнікамі і т. д.).

Работа партгабінета складаная, рознастайныя формы і метады яго работы. Партком фабрыкі, які зусім законна хоча бачыць у партгабінеце свайго непасрэднага памочніка ў прапагандысцкай і агітацыйнай рабоце, павінен дзеля гэтага перш за ўсё паклапаціцца аб тым, каб не адцягвань увагу партгабінета на такую работу, якая можа і павінна быць зроблена самім парткомам і іншымі арганізацыямі фабрыкі.

Партыйны габінет фабрыкі «Комунарка» — адзіны ў Менску, які (пры ўсіх яго недахопах) адпавядае свайму прызначэнню. Аднак ні Сталінскі райком, ні гарком, не гаворачы ўжо аб культпропе ЦК КП(б)Б, габінетам як належыць не цікавіліся і не цікавяцца. А ў габінеце ад прапагандыстаў, агітатараў і парторгаў можна атрымаць рад каштоўных заўваг аб арганізацыі прапагандысцкай і агітацыйнай работы. Прапагандысты, агітатары справядліва скардзяцца на тое, што яны не маюць матэрыялаў па гісторыі КП(б)Б, матэрыялаў па будаўніцтву БССР. Габінет, напрыклад, кансультацыю прапагандыстаў і слухачоў праводзіць выключна мясцовымі сіламі. Габінет мае абмежаваную колькасць наглядных дапаможнікаў (яны робяцца на месцы, пры гэтым непрадукцыйна губляецца шмат часу).

Безнагляднае становішча пераважнай большасці партгабінетаў прадпрыемстваў Менска, памылкі і недахопы работы габінета фабрыкі «Комунарка» павінны прыкаваць да сябе ўвагу партыйных арганізацый. Рабоце партгабінетаў, гэтаму важнейшаму звяну партыйнай прапаганды і агітацыі, патрэбна сталае кіраўніцтва і штодзённая дапамога ад парткома і ад ЦК. У барацьбе за авалоданне большэвізмам прапагандыст-агітатар, партыйны актыў павінны быць ва ўсеўзбраенні.

АЛ. ЛЕБЕДЗЕЎ.

НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ПАРТВУЧОБЫ

Таварыш Сталін указваў аб тым, што «неабходна ўзняць палітычную работу нашай партыі на належную вышыню, паставіўшы ў цэнтры ўвагі задачу палітычнай асветы і большэвіцкай загартоўкі партыйных, совецкіх і гаспадарчых кадраў».

Па даных на 1936 год у КП(б)Б меліся 1263 гурткі па вывучэнню гісторыі партыі, у якіх займалася 13.043 членаў і кандыдатаў партыі. Калі меркаваць па гэтых даных, то становішча як-быццам і добрае, а ў сапраўднасці гэта не так. Большасць гурткоў па вывучэнню гісторыі партыі амаль не займаліся, лепшыя з іх паспелі вывучыць тэму «1905 года», а астатнія затрымаліся на подступах да гісторыі партыі. Гэта атрымалася не толькі ў бягучым годзе, але ўжо стала «традыцыяй». Аб гэтай «традыцыі» комуністы гаварылі на справаздачных сходах, і на ўвесь голас скардзячыся на тое, што некаторыя комуністы на працягу 3—4 год толькі і робяць, што пачынаюць вывучаць гісторыю партыі і кожны год далей вывучэння тэмы «народніцтва» не ідуць.

У чым-жа прычына? Яна ляжыць у адсутнасці ўвагі да арганізацыйных пытанняў партвучобы. Культпропы не кантралююць праходжанне праграмы, астаўляючы гэтыя пытанні на сумленні парткомаў. Выхад з гэтага становішча адзін—увядзенне календарнага плана і ажыццяўленне строгага кантролю за яго правядзеннем.

Трэба адзначыць таксама кардынальную неабходнасць рашэння другога пытання. У КП(б)Б 2584 прапагандыстаў. Па нацыянальнаму складу яны дзеляцца так: 1397 — беларусаў, 703 — яўрэяў, 316 — рускіх. Зноў-такі, калі меркаваць па гэтых лічбах, то ў нас справа абстаіць больш чым добра. Але гэта толькі так здаецца. На самой справе ў КП(б)Б не вырашана буйнае пытанне партыйнага будаўніцтва: пытанне аб прапагандзе на роднай мове слухачоў тут пушчана па волі хваль. Культпропы нават плана пераводу прапаганды на мову слухачоў не маюць, а час-бы яго не толькі мець, але і паслядоўна выконваць.

КАЗЕЛЕЦКІ.

З АПОШНЯЙ ПОШТЫ

ВЕДАМСТВЕНАЯ АБМЕЖАВАНАСЦЬ

10 чэрвеня адкрыўся з'езд КП(б)Б, які падвядзе вынікі праведзенай работы і намеціць далейшыя шляхі па палепшанню партыйна-палітычнай работы ў КП(б)Б.

З'езд партыі — гэта выключна вялікая падзея ў палітычным жыцці партыі і рэспублікі. Уся грамадскасць з вялікаю зацікаўленасцю сачыла за падрыхтоўкай і цяпер сочыць за работай з'езда. Інакш адбылася да гэтай важнейшай падзеі газета «Літаратура і мастацтва», орган праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў.

10 чэрвеня — ў дзень адкрыцця партз'езда—вышаў чарговы нумар гэтай газеты. Ні адным словам газета не абмовілася пра гэтую важнейшую падзею ў жыцці рэспублікі.

Цікава запытаць у ч. в. а. рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва» т. Галавача, што гэта — ведамственая абмежаванасць, палітычная слепата ці — свядомае ігнараванне такой важнейшай падзеі, як XVI з'езд КП(б)Б?

Л. ГОТФРЫД

ЗА БОЛЬШЭВІЦКУЮ ПАСТАНОЎКУ СПРАВЫ ПРАПАГАНДЫ І АГІТАЦЫІ

У сваім дакладзе на Лютаўска-сакавіцкім Пленуме ЦК ВКП(б) таварыш Сталін высунуў лозунг неабходнасці авалодання большэвізмам і сказаў: «Неабходна, стала быць, павярнуць увагу работнікаў у бок партыйна-палітычных пытанняў з тым, каб поспехі гаспадарчыя спалучаліся і ішлі побач з поспехамі партыйна-палітычнай работы».

На прайшоўшых у КП(б)Б раённых і акруговых партсходах і канферэнцыях не было амаль ні аднаго прамоўцы, які-б рэзка не крытыкаваў становішча спраў у галіне прапаганды і агітацыі існуючае ў партарганізацыях КП(б)Б.

Нельга сказаць, што ў нас у КП(б)Б мала комуністаў, ахопленых вучобай. 91 проц. усіх членаў і кандыдатаў КП(б)Б навучаюцца ў гуртках і школах сеці партыйнай асветы, прычым каля 50 проц. навучаюцца ў гуртках па вывучэнню гісторыі партыі.

Цэнтральным на сёння пытаннем для большасці раёнаў БССР у справе партыйнай прапаганды з'яўляецца задача павышэння якасці вучобы. У пытаннях якасці прапагандысцкай работы ў нас ёсць рад сур'ёзных прарываў. На партсходах і канферэнцыях за гэта больш усяго крытыкавалі комуністы пастаноўку справы агітацыі і прапаганды ў КП(б)Б. Якасць залежыць ад прапагандыста,—таварыш Ленін не раз указваў на гэту акалічнасць. Таму пярвейшай арганізацыйнай задачай усіх партарганізацый у галіне прапаганды з'яўляецца:

Неадкладна выявіць усіх таварышоў, якія маюць палітычную і тэарэтычную падрыхтоўку, здольны весці прапагандысцкую работу і не вядуць яе да гэтага часу.

На бюро райкомаў трэба даць гэтым таварышам ад імя бюро ГК, РК даручэнне весці пэўны від партыйнай вучобы (гурток палітграматы, гісторыі партыі, канцылярская школа, кансультацыя прапагандыстаў у партгабінеце, чытка эпізадычных лекцый і т. д.). За лік выяўленых новых прапагандысцкіх кадраў трэба ўкамплектаваць больш моцнымі прапагандыстамі тыя гурткі і школы, дзе прапагандысты ў сучасны момант не забяспечваюць дастатковай якасці вучобы (у тым ліку і комсамольскія школы і гурткі).

Прапагандысты нашай партыі атрымалі ў свае рукі ключ да правільнага разумення і выкладання гісторыі нашай партыі—гэта ўказанні таварыша Сталіна да ўкладальнікаў падручніка па гісторыі ВКП(б).

Ужо апублікован праект праграмы гурткоў гісторыі партыі, складзены з улікам указанняў таварыша Сталіна.

Задача партыйных камітэтаў, у першую чаргу культпропаў РК, партгабінетаў, штатных прапагандыстаў раёнаў — дапамагчы ўсёй масе прапагандыстаў ужыць у сваёй рабоце ўказанні таварыша Сталіна (у партгабінетах падбіраць літаратуру па сталінскай схеме; у семінарах прапагандыстаў калектыўна прапрацаваць рад тэм гісторыі партыі ў першую чаргу тых, па якіх ідуць заняткі ў большасці школ і гурткоў раёна, арганізаваць кансультацыю найбольш пісьменных таварышоў з партактыва, у партгабінетах, лічачы такую работу ў партгабінеце адным з важнейшых відаў прапагандысцкай работы—партыйнае даручэнне.

Павышэнне якасці прапагандысцкай работы партыі — цэнтральнае пытанне, якім павінны займацца па нашай думцы ў галіне прапаганды — аддзел партпрапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б, культпропы АК, ГК і РК.

Якія рычагі тут павінны быць ва што-б там ні стала выкарыстаны?

1. Семінары прапагандыстаў (у раёнах семінарам павінен кіраваць, як правіла, сакратар РК партыі, а комсамольскім семінарам — культпроп РК або райпрапагандыст).

2. Трохмесячныя курсы перападрыхтоўкі прапагандыстаў пры ЦК КП(б)Б (у гэтым годзе праз іх павінна прайсці звыш 900 чал. прапагандыстаў). Справу тут трэба паставіць інакш чым да гэтага часу. Вельмі многа малападрыхтаваных і не вядучых прапагандысцкую работу таварышоў пасылаюцца райкомамі на гэтыя курсы.

Зараз ГК і РК павінны мець гадавы план перападрыхтоўкі прапагандыстаў. Кожны таварыш павінен загадзя (за некалькі месяцаў) ведаць, калі ён паедзе на курсы ЦК па перападрыхтоўцы. ЦК прымае меры да паляпшэння пастаноўкі выкладання на гэтых курсах.

3. Патрэбна велізарны апарат культпропаў, райпрапагандыстаў, загадчыкаў партгабінетаў, інструктароў завочнай партвучобы (па БССР па штатах РК іх павінна быць каля 500 чалавек) неадкладна ўкамплектаваць. Аддзел партпрапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б з лютага—сакавіка ўжо камандыраваў на раёны звыш 80 чалавек на культпропаўскую і прапагандысцкую работу. Аднак, трэба прама сказаць, што некамплект яшчэ тут вялікі — АК, ГК, РК КП(б)Б павінны прыкласці ўсе сілы на тое, каб перасунуць на штатную прапагандысцкую работу, на работу ў партгабінетах найбольш здольных членаў партыі (у асаблівасці з прайшоўшых курсы перападрыхтоўкі), якія-б яны пасалы зараз ні займалі. Добры прапагандыст у партыйнай арганізацыі павінен распэньвацца на вагу золата.

Ёсць рад раёнаў, асабліва пагранічных, новых, якім патрэбна дапамога людзьмі з боку ЦК. Гэта дапамога будзе аказана. Але ёсць і рад раёнаў, дзе райкомы партыі абавязаны і маюць магчымасць падабраць штатных прапагандыстаў, загадчыкаў партгабінетаў на месцы.

Трэба лічыць няправільным, што кіраўнікі некаторых такіх раёнаў толькі і робяць, што патрабуюць людзей ад ЦК, а самі не выкарыстоўваюць маючыхся на месцы магчымасцей.

У мэтах дапамогі раёнам у справе вырашчвання прапагандыстаў для раёнаў ЦК КП(б)Б з 1 верасня набірае ў вышэйшую школу прапагандыстаў пры ЦК КП(б)Б 100 чалавек. Гэтыя таварышы будуць, як правіла, па сканчэнню школы (год і тры месяцы) вернуты ў тыя раёны, якія іх камандыруюць на вучобу.

Калі мы ў бліжэйшы час зможам укамплектаваць добрымі прапагандыстамі толькі адзін штатны апарат культпропаў райкомаў партыі, прапагандыстаў, загадчыкаў партгабінетамі, інструктароў па завочнаму навучанню, то гэта ўжо будзе атрад у 500 чалавек (у сярэднім па 5 чалавек на раён) таварышоў, якія ў першую чаргу павінны бываць на занятках гурткоў, дапамагаць прапагандысту рыхтавацца да заняткаў, змагацца штодзённа за павышэнне якасці прапаганды, ускрываць усялякія скажэнні ў прапагандысцкай рабоце.

Бюро райкомаў, гаркомаў, адказваючы за справу прапаганды і агітацыі, павінны заслухоўваць на сваіх пасяджэннях даклады аб рабоце асобных школ, гурткоў (з выклікам слухачоў); павінны зацвярджаць усіх прапагандыстаў.

У сучасны момант ёсць рэальная магчымасць рэцыдываў сезоннасці ў сетцы партасветы.

Неабходна зараз-жа на бюро ГК, РК разгледзець календарны план далейшай работы сеткі партасветы па кожнаму гуртку, школе; трэба ўвесці (за лік дадатковага часу ад 30 мінут да 1 гадзіны па кожных заняткаў) інфармацыю слухачоў па пытаннях міжнароднага становішча і бягучай палітыкі. Разам з тым, трэба лічыць недапушчальным, калі без указанняў ЦК КП(б)Б мясцовыя камітэты партыі зрываюць тэмы праграмы, прапануючы вывучаць у школах, партасветы рад іншых пытанняў. Па ўсіх пытаннях, якія трэба вывучаць у сетцы партасветы, ЦК КП(б)Б заўсёды дае спецыяльныя ўказанні.

Надзвычай важнае пытанне — арганізацыя вучобы з непісьменнымі і малапісьменнымі членамі партыі, іх, як правіла, трэба аслабяніць ад вучобы ў сетцы партасветы.

У больш буйных гарадскіх партарганізацыях трэба ісці па шляху стварэння для іх спецыяльных агульнагарадскіх або раённых агульнаадукацыйных школ. Наша баявая задача ў бліжэйшыя-ж дні прыступіць практычна да гэтай работы. У сельскіх раёнах прыцягваць у парадку грамадскай нагрузкі настаўнікаў да заняткаў з малапісьменнымі комуністамі.

Аддзел партпрапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б перабудоўвае сваю работу ў напрамку аказання штодзённай дапамогі партарганізацыям у пастаноўцы агітацыйнай і прапагандысцкай работы. Мы мяркуем, што інструктары ЦК будуць рэгулярна аб'язджаць раёны. У кожным партгабінеце або доме партасветы інструктар павінен спыняцца на некалькі дзён і дапамагаць загадчыку партгабінетам і загадчыку культпропам, райпрапагандыстам паставіць, як належыць, работу партгабінета, работу школ і гурткоў, выпрацаваць на месцы суму канкрэтных мерапрыемстваў па паляпшэнню работы данага партгабінета, Дома партасветы. Ён павінен паставіць гэта пытанне на бюро РК, затым едзе ў наступны раён і праводзіць там такую-ж работу.

Найбольш удалы вопыт работы асобных дамоў партасветы, партгабінетаў і райпрапагандыстаў павінен абагульвацца аддзелам партпрапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б шляхам пастаноўкі на бюро ЦК і шляхам рассылкі апісанняў лепшых узораў работы загадчыкаў партгабінетамі культпропам, райпрапагандыстам рэспублікі.

На працягу наступнага па годзе мяркуецца ахапіць такога родзу работай усе пагранічныя і рад тылавых раёнаў рэспублікі.

Апрача мерапрыемстваў па перападрыхтоўцы прапагандыстаў аддзел партпрапаганды і агітацыі ЦК у мэтах дапамогі раёнам у бліжэйшы час арганізуе месячныя курсы агітатараў па антырэлігійнай прапагандзе.

Уводзіцца практыка пасылкі не менш аднаго разу ў месяц у пагранічныя раёны дакладчыкаў і лектароў з Менска па пытаннях, якія цікавяць раённы актыў (у асноўным міжнароднае становішча), і не менш аднаго разу ў паўтара — два месяцы — у раёны непагранічныя.

Таксама аддзел прапаганды і агітацыі арганізуе рэгулярную пасылку — адзін раз у месяц — дакладчыкаў па бягучых пытаннях на 50 прадпрыемстваў, у 50 калгасаў БССР. Пры аддзеле арганізуецца бюро дакладчыкаў і лекцый для абслугоўвання гарадоў, раёнаў і прадпрыемстваў.

Арганізуецца 1—2 разы ў месяц перадача па закрытых правадах дакладаў і лекцый па міжнароднаму становішчу для агітатараў і прапагандыстаў раёнаў Беларусі (па прыкладу дакладаў тт. Смалянцева і Пушнцава). У бліжэйшы час аддзел арганізуе выданне антырэлігійнай літаратуры і масавых брашур па бягучай палітыцы.

Наяходзячыя выбары ў органы совецкай улады на аснове Сталінскай Канстытуцыі прад'яўляюць выключныя патрабаванні да павелічэння размаху і павышэння якасці нашай агітацыйнай работы.

Сапраўды ўзначаліць паварот у палітычным жыцці краіны — гэта, у прыватнасці значыць добра паставіць большэвіцкую агітацыю.

Мы абавязаны ахапіць усіх выбаршчыкаў нашай масавай палітычнай агітацыяй.

Грэбаванне справай агітацыі можа прывесці кіраўніка арганізацыі да сур'ёзных і непрыемных нечаканасцей на выбарах. Справу тут таксама нельга вырашыць яшчэ адной рэзалюцыяй ці заклікам весці агітацыю.

Большэвіцкую агітацыю трэба арганізаваць. Тут патрабуецца неадкладна ўлічыць усе сілы партыі і комсамола, якія могуць весці агітацыйную (у тым ліку антырэлігійную) агітацыю.

Ва многіх раёнах Беларусі, напрыклад, зусім не выкарыстоўваліся для агітацыйнай работы сярод рабочых і калгаснікаў комуністы воінскіх часцей. А гэта-ж значныя кадры.

У кожным раёне БССР ёсць 200—300 настаўнікаў. Калі паставіць сярод іх правільны партыйны інструктаж, — вельмі многія з іх змогуць прарабіць вялікую расстаўнай работы ў КП(б)Б за прайшоўшы перыяд, выпрацуе суму мерапрыемстваў, якія забяспечаць поўнае ажыццяўленне ўказанняў таварыша Сталіна і Пленума ЦК ВКП(б) па пытанню ўзмацнення партыйна-палітычнай работы партыі.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Пасля таго, як дано правільнае рашэнне пытання, поспех справы залежыць ад арганізацыйнай работы *(І. СТАЛІН)*

ПРАВЕРКА ВЫКАНАННЯ — ВАЖНАЕ ЗВЯНО ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ

Да апошняга часу ў рабоце нашай партыйнай арганізацыі існавала такая практыка, што выносілі на агульных партсходах і пасяджэннях парткома шмат пастаноў і праз некалькі дзён забывалі іх. Многія нашы рашэнні былі напісаны нядрэнна, у іх намячаліся бліжэйшыя задачы ў рабоце цэхавых партгруп і ўсёй партарганізацыі завода. Але што-ж з таго, калі ўсе амаль нашы пастановы аставаліся толькі на паперы: партком не ведаў, як яны выконваліся.

Даходзіла да таго, што па аднаму і таму-ж пытанню ў адзін нават месяц выносілася некалькі пастаноў, а справа ніколькі не палепшалася. Праверка выканання не была арганізавана.

Узяць, напрыклад, такі важнейшы ўчастак партыйнай работы, як партыйная прапаганда. Гэта работа вельмі дрэнна ў нас пастаўлена. І па пытанню партпрапаганды шмат выносілі мы нядрэнных пастаноў, але бяда ў тым, што не правяралі, як яны выконваюцца. Партком непікавіўся, як працуюць прапагандысты.

Многія прапагандысты не выконвалі ўказанні парткома і агульных партсходаў, абы-як адносіліся да выканання партыйных даручэнняў. Напрыклад, прапагандысты Каплан і Кураўскі дрэнна рыхтаваліся да заняткаў, не залавальнялі слухачоў і таму наведванне іх гурткоў было вельмі дрэннае.

Мы паставілі гэтае пытанне на агульна-заводскім партыйным сходзе. Жорстка крытыкавалі комуністы партыйны камітэт і прапагандыстаў за запушчанасць партыйнай прапаганды. Нямала дасталося парткому ад комуністаў і за тое, што ён вельмі хутка забываў свае ўласныя пастановы.

Трэба сказаць, што заўвагі і крытыка радавых комуністаў вельмі дапамаглі. Зараз, напрыклад, Каплан і Кураўскі куды лепш пачалі праводзіць заняткі. А партком пачынае наладжваць праверку выканання. Вылучаны новыя кадры прапагандыстаў, як напрыклад, тт. Гаваруноў і Капельсон, якія раней не былі заўважаны парткомам.

Справаздачна-выбарчы сход ускрыў шэлы рад буйнейшых недахопаў у рабоце парткома і намеціў практычныя мерапрыемствы па ўзмацненню партыйнай работы на заводзе. Зараз мы мабілізуем усіх комуністаў нашай партарганізацыі на выкананне пастановы выбарчага схода. На выкананне рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна.

І. СТАНКЕВІЧ.
Сакратар парткома завода Гомсельмаш.

АДЗІЧЫ ПАРТЫЙНЫ ДЗЕНЬ ПА ПЫТАННЮ З'ХАВАННЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ І ПАРТЫЙНАЙ ТАЙНЫ

КІЕЎ, 9 чэрвеня (БЕЛТА). Згодна рашэння абкома КП(б)У, у Кіеве праведзен адзіны партыйны дзень, прысвечаны пытанню захоўвання дзяржаўнай і партыйнай тайны.

Выступаўшыя прыводзілі шмат фактаў палітычнай бясклопатнасці, ратазейства, балбатні, якія не павінны былі-б мець месца.

На сходзе 15-га цэха Чырвонаспяжнага завода ўказвалася, што выкрытыя ворагі народу—трацкісты і пасля іх выгнання з завода атрымлівалі ўсякія весткі аб яго рабоце.

Асабліва адзначалася на сходзе неабходнасць павышэння адказнасці комуністаў за захоўванне партыйных дакументаў.

Комуністы на ўсіх сходах заявілі аб неабходнасці ўзмацнення барацьбы за авалоданне большэвізмам, павышэнне палітычнай, агітацыйнай і прапагандысцкай работы ў масах. Да ліквідацыі палітычнай бясклопатнасці і ратазейства заклікалі большэвікі Кіева ўсіх прапоўных.

ІНСТРУКТАР ПАРТЫЙНАГА АПАРАТА

На прайшоўшых справаздачна-выбарчых партыйных сходах, раённых і гарадскіх канферэнцыях былі намечаны і прыняты канкрэтныя мерапрыемствы па ажыццяўленню гістарычных рашэнняў Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна.

Велізарную ролю ў справе дапамогі первічным партарганізацыям і райкомам партыі павінен сыграць інструктарскі склад ЦК і райкомаў КП(б)Б.

«Інструктар, — гаварыў тав. Кагановіч на нарадзе загадчыкаў аддзела кіруючых парторганаў у 1934 г., — з'яўляецца адказным прадстаўніком партыйнага камітэта ў партыйнай арганізацыі, да якіх ён прымацаван і адказвае побач з парткомамі за пастаноўку ў іх партыйнай работы. Ён павінен забяспечыць штодзённы кантроль за выкананнем пастановы ЦК і мясцовых парторганаў».

Гэтыя ўказанні выконваюцца інструктарамі нездавальняюча. Зусім заслужана комуністы падверглі суровай крытыцы работу інструктараў РК, ГК і ЦК КП(б)Б на партыйных сходах і канферэнцыях. У практыцы работы інструктарскага складу наглядаюцца дзве крайнасці. Або інструктару даручаецца галоўным чынам абследванне розных партарганізацый, або ўчасткаў работы. Другая крайнасць—калі інструктару, як-бы на волкуп, аддаецца так званы куст первічных арганізацый. Гэту практыку можна наглядаць у некаторых райкомах партыі. Напрыклад, у Кіраўскім раёне інструктар РК жыў за 35 кіламетраў ад рённага пэнтра і прадстаўляў сабою штосьці накшталт філіяла райкома.

Ператварэнне інструктара ў работніка, раз'язджаючага па асобных заданнях, мае месца і ў аддзеле кіруючых парторганаў ЦК КП(б)Б. З прычыны таго, што заданні ў пераважнай большасці выпадкаў носяць характар абследвання, то зусім зразумела, што інструктар не дзеліцца станоўчым вопытам, менш усяго дапамагае райкомам арганізаваць работу і сам не высоўвае перад кіруючымі парторганамі пытанні па палепшанню работы партыйных арганізацый.

Больш таго, у частцы інструктараў укаранілася зусім няправільнае і шкоднае ўяўленне аб тым, што іх задача заканчваецца напісаннем дакладной запіскі і прыняццем рашэння ЦК або РК па таму ці іншаму пытанню. Інструктар да гэтага часу скарыстоўваўся як абследвацель перш за ўсё таму, што планаў работы не было як у аддзелах, так і ў інструктарскіх групах, якія абслугоўваюць тую ці іншую зону. Замест планавых пытанняў была цякучка. З-за патоку заяў, сігналаў, другарадных спраў інструктары апускалі важнейшыя вузлавыя пытанні партыйнай работы.

Работа інструктараў аддзела кіруючых парторганаў над пратаколамі бюро РК не змяняе гэтага становішча. Гэта работа несумненна ставіць інструктара ў вядомай меры ў курс работы райкома партыі, але ніяк не можа замяніць яму плана ў яго ўласнай рабоце і не дае яму глыбокага ведання работы партыйных арганізацый.

Такое становішча тлумачыцца не толькі тым, што мы, інструктары, не ўмеем правільна арганізаваць сваю работу, не навучыліся сканцэнтраваць сваю ўвагу на вузлавых пытаннях партыйнай работы, але і няправільнай арганізацыяй работы інструктараў з боку загадчыкаў аддзелаў ЦК і сакратароў райкомаў КП(б)Б.

У Сіроцінскім раёне захавалася даўно асуджаная практыка прымацавання інструктараў да сельсоветаў. А ў Парыцкім раёне былі нават асобныя выпадкі занясення інструктара на чорную дошку за невыкананне сельсоветам яго зоны гаспадарчых кампаній. У цэлым радзе раёнаў інструктараў РК і зараз скарыстоўваюць у якасці ўпаўнаважаных па сельсоветах.

Інструктары тых-жа Сіроцінскага і Парыцкага райкомаў часта падмяняюць парторгаў. Яны пішуць планы парторгам, складаюць ім справаздачы, рэзалюцыі. Без інструктара парторг не праводзіць нават партыйных сходаў і т. д. Ясна, што такая «дапамога» толькі абязлічвае парторга, знімае з яго адказнасць, затрымлівае яго рост.

Для таго, каб сапраўды дапамагчы сакратару парткома, парторгу задача інструктара — узняць свой ідэйна-палітычны ўзровень і больш глыбока ведаць партыйную работу, асвоіць сваю кваліфікацыю. Мы маем такія факты, калі нават інструктары ЦК КП(б)Б не ўсе і не заўсёды сістэматычна чытаюць перыядычную літаратуру па пытаннях партыйнай работы і недастаткова арыентуюцца ў вялікіх пытаннях міжнароднага і ўнутранога характара. Інструктар павінен быць у курсе ўсіх галін партыйнай работы, чаго няма ў сучасны момант. Інструктары аддзела кіруючых парторганаў зусім нездавальняюча азнаёмлены з становішчам партыйнай асветы і палітычнай агітацыяй. Інструктары аддзела партпрапаганды і агітацыі, як правіла, недастаткова ведаюць работу ў галіне партыйнага будаўніцтва. Інструктары прамаддзела, совепка-ганлёвага аддзела не знаходзяцца пастаянна ў курсе пытанняў партыйнай работы, бо гэтыя аддзелы амаль да апошняга часу займаліся больш за ўсё гаспадарчай работай.

Лозунг таварыша Сталіна аб авалоданні большэвізмам, — абавязвае інструктараў зрабіць важнейшай сваёй справай узняцце свайго палітычнага ўзроўню, пяспынна працаваць над вывучэннем твораў Маркса—Энгельса — Леніна — Сталіна. ЦК і РК КП(б)Б, улічваючы раз'язныя ўмовы работы інструктараў, павінны ў гэтых адносінах аказаць інструктарам сур'ёзную дапамогу. Апрача вучобы ў гуртках, неабходна арганізаваць індывідуальную вучобу інструктараў, прымацоўваючы да іх лепшых прапагандыстаў, кваліфікаваных педагогаў. Уключэнне інструктараў у сістэму курсаў, якія арганізоўваюцца рашэннямі Пленума ЦК для сакратароў парткомаў і райкомаў, дапаможа палітычнаму і культурнаму росту інструктараў ЦК і РК.

Вялікую ролю ў справе ўзняцця дзелавой кваліфікацыі могуць адыграць агульныя нарады інструктараў аддзелаў ЦК і райкомаў, а таксама інструктарскія нарады ўнутры аддзелаў па пытаннях як партыйнага будаўніцтва, так і па абмену вопытам работы. Толькі сур'ёзная работа над сабой, глыбокае прадумванне пытанняў партыйнага будаўніцтва дасць інструктару магчымасць узняць сваю ідэйна-палітычную ўзброенасць і большэвіцкую пільнасць. Іменна гэтымі якасцямі павінен авалодаць кожны партыйны работнік.

Другая задача, якая стаіць перад інструктарамі, заключаецца ў перабудове метадаў іх работы. Нельга цяпер працаваць старымі метадамі, метадамі абследванняў. Цэнтр цяжару работы інструктара трэба перанесці на арганізацыю дапамогі, абмен вопытам работы, забеспячэнне арганізацыйнымі мерапрыемствамі на выкананню палітычных задач.

Аддзел кіруючых парторганаў ЦК КП(б)Б паслаў сваіх інструктараў у некалькі первічных партарганізацый і райкомаў для вывучэння работы і аказання практычнай дапамогі партыйным арганізацыям па перабудове партыйна-палітычнай работы з тым, каб станоўчы вопыт работы перадаць усім партыйным арганізацыям і інструктарам.

Трэба памятаць, што ўменне своечасова ўхапіць і высунуць асноўныя пытанні партыйнай работы немагчыма без наяўнасці планаў работы. Вось чаму ў аддзелах ЦК, у райкомах павінны быць планы работы. Планавасць прымусіць інструктараў прадумаць пытанні сваёй работы, вылучыць у даны момант важнейшыя пытанні, а таксама дапаможа ЦК і РК пры праверцы работы і самога інструктара.

А ў гэтых адносінах дрэнна абстаіць у нас справа. — Калі прагледзець, напрыклад, планы работы інструктараў Парыцкага РК КП(б)Б тт. Тарасава, Аўчыннікава, — убачым, што яны з'яўляюцца прыкладам таго, як не трэба складаць планы. У плане тав. Тарасава скрозь і ўсюды ўключаны такія пытанні, як заслухань такога-та комуніста, агітатара і т. д. Словам, гэта не план інструктара, а план парторга. У плане тав. Аўчыннікава ёсць рад вельмі важных і змястоўных пытанняў, але іх так многа, што план яўна нерэальны. Тав. Аўчыннікаў паставіў сабе мэтай, як мага больш навязаць партарганізацый, не клапоцячыся аб канкрэтнай дапамозе ім.

Частка інструктараў да гэтага часу не змянілі сваіх адносін да друку. Некаторыя таварышы не зразумелі, што без пастаяннага ўдзелу партыйных работнікаў у газеце і журнале адны работнікі друку не сумеюць узняць справу сістэматычнага асвятлення партыйнага жыцця. Друк павінен быць максімальна скарыстан інструктарам для абмену станоўчым вопытам, для асуджэння адмоўных фактаў, для арганізацыі новых форм і метадаў партыйнай работы.

Паспяховае выкананне вялікіх адказных задач, якія стаяць перад інструктарамі, як важнейшым звяном партапарата, немагчыма без палепшання штодзеннага кіраўніцтва і кантролю за іх работай з боку ЦК і райкомаў КП(б)Б.

Узаемасувязь і інфармацыі, напрыклад, інструктараў аддзела кіруючых парторганаў, якія абслугоўваюць прамысловыя партарганізацыі і інструктараў промаддзела ЦК дапамагла больш ведаць і своечасова выпраўляць выкрытыя недахопы. Інструктары райкомаў і гаркома скрозь і ўсюды спразяліва скардзяцца на дрэннае кіраўніцтва з боку сакратароў РК, на тое, што аддзел кіруючых парторганаў ЦК рэдка іх збірае, што інструктары ЦК пры наведванні раёнаў часта не лічаць патрэбным нават пагутарыць з імі, дапамагчы ім у рабоце.

Трэба ўстанавіць рэгулярныя нарады інструктараў па пытаннях арганізацыі і абмену вопытам іх работы. Неабходна праводзіць не раздзей аднаго разу ў тры месяцы пад кіраўніцтвам сакратароў ЦК нараду ўсіх інструктараў ЦК, на якіх былі-б пастаўлены задачы работы інструктараў на пэўны адрэзак часу.

Пасля XVI з'езда КП(б)Б неабходна сабраць куставыя нарады інструктараў РК, практыкуючы скліканне такіх нарад не раздзей аднаго разу ў поўгода. Райкомам партыі паміма нарад інструктараў трэба ўвесці ў практыку сзаёй работы справаздачы інструктараў на бюро і пленумах райкомаў, прыцягнуць інструктараў да распрацоўкі планаў работы РК і асобных пытанняў партыйнага будаўніцтва. Трэба прыняць рашучыя меры да палепшэння ўмоў работы інструктараў (пакой для работы, транспарт і інш.), у першую чаргу гэта адносіцца да сельскіх раёнаў.

Неабходна зрабіць рашучы паварот у бок яшчэ большага вывучэння кадраў, абавязковага ўдзелу інструктара ў іх падборы, расстаноўцы і вылучэнні кадраў і прыцягнення інструктара да работы па стварэнню рэзерва работнікаў.

З асаблівай узагай інструктар павінен аднесціся і аказаць дапамогу ўпершыню выбраным парторгам і сакратарам парткомаў і створанаму інстытуту намеснікаў сакратароў парткомаў і райкомаў. Зусім ненармальна, што інструктары ЦК і РК КП(б)Б слаба ведаюць актыў партыйных работнікаў, не гаворачы ўжо аб беспартыйным актыве. Некаторыя загадчыкі аддзелаў ЦК і сакратары РК часта не лічаць патрэбным запытаць нават інструктара пры вылучэнні таго ці іншага работніка зоны яго абслугоўвання і гэтым зніжаюць адказнасць інструктара за кадры.

Трэба практыкаваць дачу партработнікам раёну даручэнняў з боку аддзелаў ЦК і прыцягненне інструктарамі ЦК і РК асобных тазарышоў з партыйнага актыва для вывучэння, абследвання і правядзення тых або іншых партыйных мерапрыемстваў.

Трэба рашуча адмовіцца ад агульнага падыходу з боку інструктара да комуністаў. Толькі шляхам вывучэння кожнага комуніста, кожнага партыйнага актывіста інструктар зможа адабраць і вырашчваць моцныя кадры партыйных работнікаў.

Узросшая палітычная актыўнасць комуністаў, павышанае іх патрабаванне да сваіх кіраўнікоў абавязвае інструктараў ЦК і РК КП(б)Б рашуча палепшыць метады сваёй работы. Толькі сапраўдная штодзённая сувязь з комуністамі, упартай і карпатлівай работай з імі інструктар пакажа прыклады як трэба выкрываць ворагаў народу, аказка сапраўдную дапамогу партарганізацыям у выкананні задач, пастаўленых Пленумам ЦК ВКП(б) і вялікім Сталіным.

Інструктары аддзела кіруючых парторганаў ЦК КП(б)Б
БАГДАНАЎ, ЯКУБ.

Дэлегаты XVI з'езда КП(б)Б (злева направа): тт. Фішбейн, Леановіч, Марозаў (дэлегаты ад аршанскай партарганізацыі) і справа т. Лепкоў (ваенны пракурор).
Фото Я. Салавейчыка.

ДАПАМАГАЦЬ ПЯРВІЧНЫМ ПАРТЫЙНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ

Прайшло з часу выбараў парторганаў каля двух месяцаў. Новаабраны райком прыступіў да выканання ўказанняў членаў і кандыдатаў партыі. Мы ўлічылі асабліва тую акалічнасць, што большасць парторгаў абраны ўпершыню. Ім было вельмі цяжка пачаць партыйна-выхаваўчую работу, складаць планы, арганізоўваць правядзенне сходаў партыйных арганізацый. Многія з іх шукалі нейкіх новых форм і метадаў работы, у той час, калі ў рашэннях Лютаўска-сакавіцкага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказаннях таварыша Сталіна намечана канкрэтная праграма перабудовы ўсёй партыйнай работы.

І таму бюро райкома рашыла склікаць нараду парторгаў, на якой абмеркавалі пытанне, як выконваюцца рашэнні справаздачна-выбарчых сходаў. Райком яшчэ раз зрабіў для сябе вывад, што неабходна штодзённая канкрэтная дапамога первічным арганізацыям. Зараз інструктары райкома аказваюць аператыўную дапамогу кожнаму парторгу ў складанні плана, арганізацыі і правядзенні сходаў, размеркаванні партыйных даручэнняў і наладжванні палітычна-агітацыйнай работы. У выніку такой дапамогі значна ажывілася партыйная работа на картоннай фабрыцы, лесазаводзе, кансервабудаўніцтве, РВК і іншых первічных партыйных арганізацыях.

Па даручэнню бюро інструктар райкома тав. Гульман дэтальна праверыў адну первічную арганізацыю (промарцеляў), як разгорнута партыйна-палітычная работа. Аказалася, што ўпершыню абраны парторг тав. Фрумін фактычна не ведаў з чаго пачаць. Вынікі абследвання мы абмеркавалі на бюро і прынялі рашэнне, у якім далі ўказанні кожнай первічнай арганізацыі як канкрэтна выконваць пастановы справаздачна-выбарчых сходаў.

Апрача гэтага бюро райкома прыняла рашэнне аб правядзенні ў чэрвені і ліпені агульных сходаў первічных партыйных арганізацый з дакладам парторгаў аб выкананні ўказанняў комуністаў на справаздачна-выбарчых сходах. На кожным сходзе будзе ўдзельнічаць работнік райкома. Ужо распачата выкананне нашай пастановы. Так, у первічнай арганізацыі РВК комуністы заслухалі справаздачу парторга.

Райком рэзка крытыкавалі на сходах за недастатковае кіраўніцтва прапагандай і агітацыяй. Бюро райкома прыняла рад мер, каб падрыхтавана сустрэць выбары ў вярхоўныя органы Совецкай. Мы падабралі добра падрыхтаваных комуністаў, комсамольцаў і спачуваючых і вылучылі іх агітатарамі. Даручылі таварышам з партыйнага актыва кіраваць агітацыйнымі калектывамі. Прыступілі да правядзення палітдзён у соўгасах, калгасах і вытворчых брыгадах.

У горадзе ўводзім практыку арганізацыі мітынгаў працоўных. Райком намеціў правесці першы мітынг 12 чэрвеня з дакладам аб міжнародным становішчы. Дакладчыкам вылучылі падрыхтаванага комуніста дырэктара пединстытута тав. Кардаша. Мітынг будзе трансліравацца па радыё па ўсяму гораду. Для гэтага выкарыстоўваем шматлюдныя плошчы для збораў прапоўных.

Значна палепшылі прапаганду. Комуністы пачалі сур'ёзна вывучаць гісторыю нашай большэвіцкай партыі. Партыйныя школы займаюцца рэгулярна з поўным наведваннем слухачоў.

Але ўсё гэта толькі нязначны пачатак. Мы ўсё-ж яшчэ не аказваем неабходнай аператыўнай дапамогі ўсім сельскім первічным арганізацыям. Неабходна многа працаваць, каб поўнасцю выканаць каштоўныя ўказанні комуністаў на справаздачна-выбарчых сходах, якія выпякалі з гістарычных рашэнняў Лютаўска-сакавіцкага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна.

Сакратар Рагачоўскага райкома партыі
КУЗНЯЦОЎ.

А. АУГУСТАЦІЦІС

ПАДРЫХТАВАЦЬ ЛКСМБ ДА ВЫБАРАЎ У СОВЕТЫ

Для моладзі ўвядзенне Сталінскай Канстытуцыі прадстаўляе асобае значэнне. 18-галовыя юнакі і дзяўчаты, якія нарадзіліся пасля рэволюцыі, ды і незадоўга да рэволюцыі, будуць упершыню прымаць удзел у выбарах у советы, у выбарах, якія, к таму-ж, будуць праходзіць на нябачаных яшчэ ў гісторыі развіцця чалавецтва сапраўды дэмакратычных пачатках.

Вось чаму як ніколі ўзрастае роля нашага ленінскага комсамола, як важака моладзі.

«Увядзенне новай Канстытуцыі Саюза ССР азначае карэнны паварот у рабоце ўсіх арганізацый ВЛКСМ. Сутнасць гэтага павароту заключаецца яшчэ ў большым упягненні моладзі ў палітычнае жыццё краіны, у работу па кіраванню дзяржавай, ва ўзмацненні палітычнай актыўнасці моладзі». (З рашэнняў III пленума ЦК ВЛКСМ).

Поллы шпіёны, дыверсанты і тэрарысты, трацкісты, правыя нацыянал-фашысты і іншая гідота ў барацьбе супроць партыі, супроць совецкай улады будзе прабаваць скарыстаць выбары ў сваіх мэтах. У гэтай барацьбе ўсімі мерамі яны будуць прабаваць скарыстоўваць нявопытную, не прайшоўшую яшчэ школы большэвіцкага выхавання моладзь. Асабліва гэта трэба ўлічыць нам, ЛКСМБ, бо наша рэспубліка непасрэдна мяжуе з капіталістычным Захадам.

Комсамол Совецкай Беларусі абавязан аховаць сваім уплывам, сваім палітычным выхаваннем усю без выключэння моладзь Совецкай Беларусі. Каб справіцца з гэтай важнейшай палітычнай задачай, ЛКСМБ трэба перш за ўсё знішчыць маючыяся буйнейшыя недахопы, адзначаныя ў рашэннях Пленума ЦК ВКП(б), у дакладзе і заключным слове таварыша Сталіна.

Нядаўна прайшоўшыя пленумы ЦК ВЛКСМ і ЦК ЛКСМБ, кіруючыя ўказаннямі таварыша Сталіна, вызначылі сутнасць гэтых недахопаў у комсамоле і канкрэтныя шляхі іх выпраўлення.

Яшчэ да гэтага часу ў ЛКСМБ існавала як масавае з'явішча практыка ўаптапы, прызначэнчества, перакідак, галасаванне спісам, складзеным без удзелу комсамольцаў. Каптавалі, груба парушалі ўнутрысаюзную дэмакратыю ўсе, пачынаючы з ЦК. Замест дэмакратычнага цэнтралізма, як асновы саюза, у нас атрымаўся бюракратычны цэнтралізм. І ў нас у ЦК, у АК, ГК і РК ды і ў первічных арганізацыях, якія заразіліся гэтым дрэнным прыкладам, пленумы, камітэты існуюць для формы. Яны не працавалі і не неслі адказнасці за арганізацыю. Калегіяльнасць у кіраўніцтве часта падмянялася ў ЛКСМБ грубым адміністраваннем, вокрыкамі. Апарат ЦК аказаўся ў значнай ступені адарваным ад комсамольцаў і моладзі, недастаткова аператыўна ўмешваўся ў штодзенную работу акруткомаў, гаркомаў і райкомаў.

Грубейшыя парушэнні ўнутрысаюзнай дэмакратыі, адсутнасць большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі паслаблялі нашу работу па палітычнаму выхаванню комсамольцаў і моладзі, прытуплялі рэволюцыйную пільнасць, стварылі абстаноўку дабрадушнасці і палітычнай бясклопатнасці, якую скарыстаў вораг, пранікаючы не толькі ў ЛКСМБ, але і да кіраўніцтва.

Пранікаючы ў рады ЛКСМБ і ў кіраўніцтва, ворагі народу—трацкісты, бухарынцы, нацыянал-фашысты, як гэта мела месца ў віцебскім ветэраінстытуце, менскім пединстытуце, у рэдакцыях газет: «Чырвоная змена», «Піонер Беларусі», «Юнгер ленінец» і ў радзе іншых арганізацый, шкодзілі на такім участку, як палітычнае выхаванне моладзі.

Прайшоўшы пленум ЦК ЛКСМБ адзначыў, што: «У арганізацыі комсамола Беларусі і па гэты дзень не выкарчаваны да канца элементы дабрадушнасці, самасупакоенасці, не мабілізаваны ўсе кадры пасапраўднаму на барацьбу за выкрышчэ ворагаў на павышэнне неабходнай рэволюцыйнай пільнасці і непрымірымых адносін да ўсякага роду праяў варожых антысовецкіх уплываў».

Усё гэта пленум рашуча асудзіў і прапанаваў:

«Усім комсамольскім работнікам Беларусі зрабіць неабходныя вывады ў сваёй рабоце з таго факта, што «пакуль існуе капіталістычнае акружэнне, будуць існаваць у нас шкоднікі, шпіёны, дыверсанты і забойцы, засылаемыя ў нашы тылы агентамі замежных дзяржаў». (Сталін).

Нам патрэбна заняцца сваёй кроўнай справай — палітычным выхаваннем моладзі, справай палітычнай прапаганды і агітацыі. Галоўная задача ЛКСМБ — авалодаць большэвізмам, вывучаць гісторыю нашай большэвіцкай партыі.

Вывучэнне моладзю асноў большэвізма, вучэння Леніна—Сталіна, вывучэнне вопыта барацьбы партыі з ворагамі партыі і совецкай улады з'яўляецца галоўнай асновай большэвіцкага выхавання комсамольцаў і моладзі.

Сутнасць перабудовы работы комсамола, якая ажыццяўляецца па ўказаннях таварыша Сталіна, увесь сэнс рашэнняў X з'езда ВЛКСМ і апошніх рашэнняў пленумаў заключаецца іменна ў тым, каб прапаганда, як важнейшы сродак комуністычнага выхавання моладзі, стала першаступеннай задачай усіх комсамольскіх арганізацый, кожнага кіраўніка і комсамольца ў паасобку.

Аднак, прапагандысцкая работа працягвае аставацца на яўна нездавальняючым узроўні і не аказвае тым патрэбаванням, якія прад'яўляе нам зараз партыя. І зусім правільна ЦК ВЛКСМ у сваіх пастановах і «Комсомольская правда» ў сваіх артыкулах крытыкавалі кіраўніцтва ЦК, ГК і РК ЛКСМБ за незадавальняючае становішча прапагандысцкай работы ў комсамоле Беларусі.

Мы, кіраўніцтва, лічым займацца ўсім чым хочаце, але толькі не прапагандай, перадаваўраем гэту справу часта дрэнна падабраным і часта непісьменным прапагандыстам.

Кіраўнікі ЛКСМБ абавязаны сур'ёзна палумаць аб рабоце над сабой, аб сваёй асабістай вучобе; абавязаны зразумець сваю ролю як палітычных кіраўнікоў моладзі. Партыя і комсамол патрабуюць ад кіраўнікоў, каб яны маглі выкладаць у гуртках па гісторыі партыі і ленінізму; каб яны маглі даць ясны і дакладны адказ на ўсе пытанні, якія цікавяць нашых комсамольцаў і моладзь.

Адной з важнейшых задач выхавання комсамольцаў і моладзі з'яўляецца далучэнне моладзі да культурнага будаўніцтва. ЛКСМБ абавязан, пачынаючы ад ЦК і канчаючы первічнымі арганізацыямі, узмацніць сваю работу ва ўсіх галінах нацыянальна-культурнага будаўніцтва (літаратура, мастацтва, школы). Асобае значэнне набывае для ЛКСМБ работа сярод настаўніцтва, як аднаго з асноўных праваднікоў культуры ў вёсцы.

У сувязі з надыходзячымі выбарамі ў советы асаблівая адказнасць ускладаецца на комсамол вёскі. А становішча сельскіх райкомаў і первічных арганізацый і па гэты дзень астаецца зельмі нездавальняючым. За прайшоўшы 1936 год, не глядзячы на агульнае захапленне ростам у арганізацыі за лік калгаснікаў, а таксама і некаторае павелічэнне колькасці первічных арганізацый ва многіх сельскіх раёнах (Мсціслаўль, Барысаў, Лепель, Клімавічы, Старыя Дарогі, Жлобін і інш.), колькасць членаў комсамола ў первічных арганізацыях зменшылася, у прыватнасці, зменшылася колькасць комсамольцаў-калгаснікаў.

У нас яшчэ вельмі недастаткова насычанасць калгасаў первічнымі комсамольскімі арганізацыямі (21 проц. у адносінах да ўсёй колькасці калгасаў). Яшчэ і да гэтага часу існуюць нешматлікія арганізацыі і комсамольцы-адзіночкі таму, што многія первічныя комсамольскія арганізацыі працуюць замкнута, адарваны ад мас калгаснай моладзі.

З усяго гэтага трэба зрабіць вельмі сур'ёзныя вывады і прыступіць да неадкладнага выканання рашэнняў пленума ЦК. Комсамольцам, так называемым адзіночкам, неабходна дапамагчы старшыням первічных арганізацый. Кожную нешматлікую арганізацыю трэба ператварыць у масавую баявую палітычную адзінку, у сучаснага важака моладзі. Дабіцца таго, каб да выбараў у советы ў большасці калгасаў былі створаны первічныя комсамольскія арганізацыі.

Комсамол вёскі павінен узмацніць сваю работу сярод усіх слаёў вясковай моладзі, у тым ліку сярод моладзі, падвергнутай антынароднаму ўплыву ўсякіх рэлігійных і сектанцкіх арганізацый. Трэба аднавіць антырэлігійную прапаганду сярод моладзі.

Выбары ў комсамольскія арганізацыі, у прыватнасці ў ЛКСМБ, на шырокіх дэмакратычных пачатках шляхам тайнага галасавання павінны арганізацыйна ўмацаваць первічныя арганізацыі, і будуць сур'ёзным экзаменам для падрыхтоўкі да выбараў у советы.

Перад ЛКСМБ стаяць вялікія палітычныя задачы, вырашыць якія мы зможам толькі пры ўмове карэннага палепшання партыйнага кіраўніцтва комсамолам зверху данізу.

Нядаўна ЦК КП(б)Б спецыяльна правяраў становішча партыйнага кіраўніцтва комсамольскай арганізацыяй у Плешчаніцкім раёне. ЦК КП(б)Б устанавіў, што Плешчаніцкі РК КП(б)Б і первічныя партыйныя арганізацыі самаўхіліліся ад кіраўніцтва комсамолам, перадаверыўшы ўсё кіраўніцтва так называемым партрымацаваным, у рэзультаце чаго належнай сапраўднай дапамогі з боку партыйнай арганізацыі комсамолу не было.

Аналагічнае становішча можна сустрэць і ў радзе іншых партыйных арганізацый. Такая практыка партыйнага кіраўніцтва комсамольскімі арганізацыямі з'яўляецца вельмі неяпрымай і патрабуе самага строгага асуджэння.

Бясспрэчна, XVI з'езд КП(б)Б аддасць неабходную ўвагу пытанням работы комсамольскіх арганізацый, усямернаму ўмацаванню партыйнага кіраўніцтва і намеціць шляхі да знішчэння ўсіх недахопаў у рабоце ЛКСМБ, у асаблівасці ў справе палепшэння палітычнага выхавання комсамольцаў і моладзі.

У ПРАКУРАТУРЫ САЮЗА ССР

Справа арыштаваных органамі НКВД у розны час **Тухачэўскага** М. Н., **Якіра** І. Э., **Убарэвіча** І. П., **Корка** А. І., **Эйдэмана** Р. П., **Фельдмана** Б. М., **Прымакова** В. М. і **Путна** В. К. расследваннем закончана і перадана ў суд.

Указаныя вышэй арыштаваныя абвінавачваюцца ў парушэнні вайсковага абавязку (прысягі), здрадзе радзіме, здрадзе народам СССР, здрадзе Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Следчымі матэрыяламі ўстаноўлен удзел абвінавачваемых, а таксама пакончыўшага жыццё самагубствам Гамарніка Я. Б. у антыдзяржаўных сувязях з кіруючымі ваеннымі коламі адной з іншаземных дзяржаў, якая вядзе непрыязную палітыку ў адносінах СССР. Знаходзячыся на службе ў ваеннай разведцы гэтай дзяржавы, абвінавачваемыя сістэматычна дастаўлялі ваенным колам гэтай дзяржавы шпіёнскія весткі аб становішчы Чырвонай Арміі, вялі шкодніцкую работу на аслабленню магутнасці Чырвонай Арміі, імкнуліся падрыхтаваць на выпадак ваеннага нападу на СССР паражэнне Чырвонай Арміі і мелі сваёй мэтай садзейнічаць аднаўленню ў СССР улады памешчыкаў і капіталістаў.

Усе абвінавачваемыя ў прад'яўленых ім абвінавачаннях прызналі сябе вінаўнымі поўнасцю.

Разгляд гэтай справы будзе адбывацца сягоння, 11 чэрвеня, у закрытым судовым пасяджэнні спецыяльнага судовага прысутства Вярхоўнага суда Саюза ССР у складзе: старшынствуючага — старшыні Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР армваенюрыста тав. **Ульрыха В. В.** і членаў прысутства — нам. наркома абароны СССР нач. паветраных сіл РСЧА камандарма 2-га ранга тав. **Алксніса** Я. І., маршала Совецкага Саюза тав. **Будзённага С. М.**, маршала Совецкага Саюза тав. **Блюхера** В. К., нач. генеральнага штаба РСЧА камандарма 1-га ранга **Шапашнікава Б. М.**, камандуючага войскамі Беларускай ваеннай акругі камандарма 1-га ранга тав. **Белова** І. П., камандуючага войскамі Ленінградскай ваеннай акругі камандарма 2-га ранга тав. **Дыбенка** П. Е., камандуючага войскамі Паўночна-Каўказскай ваеннай акругі камандарма 2-га ранга тав. **Кашырына** Н. Д. і камандзіра 6-га кавалерыйскага казацкага корпуса імя таварыша **Сталіна** камдзіва тав. **Гарачова** Е. І.

Справа слухаецца ў парадку, устаноўленым законам ад 1 снежня 1934 года.

(БЕЛТА).

БЛІСКУЧЫ ПОСПЕХ СТАХАНАЎЦАЎ-ТАРФЯНІКАЎ

КАЛІНІН, 9 чэрвеня. (Кар. «Правды»). На буйнейшай распрацоўцы Калінінскага торфатрэста «Васільеўскі мох» стахановская брыгада тав. Кліманова дабілася бліскучага поспеху. На 63 дні раней тэрміну яна скончыла выкананне сезоннага задання, выпрацаваўшы 3.500 тон машынафармовачнага торфу.

ВЫЙГРЫШЫ ПА ПАЗЫЦЫ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

⊙ Менская ашчадкаса на 10 мая выплаціла выйгрышаў па першаму тыражу павыкі 2-й пяцігодкі звыш поўмільёна руб.

⊙ Рабочы гомельскага індустрыяльнага тэхнікума т. Зарэцкі на аблігацыю серыі № 19218 выйграў 3600 руб. Па гэтай-жа аблігацыі работнік Слуцкай акруговай міліцыі выйграў 1500 рублёў, а другі грамадзянін атрымаў другую палову выйгрыша. На гэты-ж нумар выйгрыш у 3600 руб. паў на заложаную пад ссуду аблігацыю ў Рэчыцкай ашчадкасе, і праз бюро праверкі пры кіраўніцтве ашчадкас рэспублікі выяўлен выйгрыш у 3000 руб. у Суражы. Такім чынам на аблігацыю серыі № 19218 выпала па БССР 5 буйных выйгрышаў.

⊙ Частка грамадзян не выкупіла заложаныя пад ссуды аблігацыі да наступлення першага тыража. Як вядома, па ўмовах выдачы ссуд гэтыя аблігацыі абязлічваюцца і выйгрышы паступаюць у карысць дзяржавы. Па Менску на заложаныя аблігацыі пала 45 тысяч рублёў, па Рэчыцы—18.800 руб., Магілеве — 18.500 руб., Бабруйску — 15.400 руб. і т. д.

⊙ Ад грамадзян паступаюць запросы, чаму ў апублікаванай таблицы выйгрышаў мала нумароў выйграўшых аблігацый, у той час, калі ў тыражы ўдзельнічала вялікая сума выйгрышаў. Справа ў тым, што кожны нумар серыі аблігацыі, якія ўказаны ў таблицы, мае 200 аднолькавых аблігацый і ўнутры кожнай серыі ёсць 50 нумароў. Такім чынам кожны нумар серыі, на які паў выйгрыш, азначае 10 тысяч выйгрышаў.

СУСТРЭЧНЫЯ ПЕРАВОЗКІ

У Гомель штогод завозяцца тысячы тон цукру. На адзін толькі камбінат «Спартак» паступае на працягу года 8 тысяч тон. Парожныя мяхі (каля 100 тыс. шт.) па распараджэнню дырэктара Беларускай канторы Цукразбыта Шаліміы патрэбна адпраўляць назад у Мінск. Для гэтага неабходна заняць каля 18 — 20 вагонаў. А часта мяхі адпраўляюць багажом, што зноў-такі выклікае шмат затрат. Гэта толькі па аднаму прадпрыемству.

У Менску-ж пасля сартавання мяхі адпраўляюць праз Гомель на Украіну, на пукровыя заводы. Для таго, каб унікнуць сустрэчнай перавозкі і скараціць лішнія грашовыя выдаткі, не раз мясцовыя работнікі ўносілі прапановы, каб гэтую тару адпраўлялі прама на заводы з Гомеля. Аднак, Шаліма чамусьці настойвае на сваім. Зусім незразумела, чаму ўпарты адміністратар да сёнешняга дня бескарысна растрачвае дзяржаўныя грошы.

Н. К. ГУК.

СПАРТЫЎНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

У гонар XVI з'езда КП(б)Б у Менску будуць праведзены вялікія спартыўныя спаборніцтвы. 18 чэрвеня на ўсебеларускім стадыёне адбудзецца фінал матча 3-х гарадоў БССР (Менска, Гомеля і Віцебска) па лёгкай атлетыцы. На стадыёне таксама выступяць лепшыя гімнасты рэспублікі са складанымі практыкаваннямі на турніку, брусах і гімнастычным стале. Свята скончыцца футбольным матчам.

У водным басейне менскага Дома Чырвонай Арміі праводзяцца 17—18 чэрвеня паказальныя выступленні і гарадскі розыгрыш пяршынства па плаванню. У праграме спаборніцтваў—мужчынскія, жаночыя і дзіцячыя заплывы на 25, 50, 100 і 200 метраў рознымі стылямі плавання, эстафеты, фігурныя прыжкі ў ваду і ігры ў воднае поло.

На першым кілометры Магілеўскага шасе 18 чэрвеня адбудуцца шасейныя веларонкі. Каля 70 велагоншчыкаў горада будуць аспрэчваць пяршынства на дыстанцыях у 5, 10, 15, 25 кілометраў.

ВЫЛАЎЛІВАННЕ ДРАУНІНЫ З ДНА РЭК

Штогод у часе сплаўных работ на дно рэк асядае дзесяткі тысяч кубаметраў лесу. У мінулым годзе было вынята тапляку 137 тысяч кубаметраў. У сувязі з набліжэннем перыяда спаду вады, зараз у сплаўканторах і леспрамгасах рэспублікі праводзіцца падрыхтоўка да выемкі са дна рэк звыш 100 тысяч кубаметраў затануўшага лесу. Апрача таго рад прадпрыемстваў, якія знаходзяцца на берагах рэк, самі арганізуюць вылаўліванне патануўшай драўніны. Так, рачыцкая фабрыка «10 Кастрычнік» у мінулым годзе выцягнула 2·600 кубаметраў добраякаснай лясной пароды.

ЛЕКЦЫЯ ВЯДОМЫХ СОВЕЦКІХ ВЫНАХОДЦАЎ

Маскоўскі прафесар Гевелінг вынайшоў спосаб павярхоўнай загартоўкі сталі электратокам, якая павялічвае працягласць работы рабочых паверхняў сталёвых дэталяў машын у 2—4 разы. Рашэннем Камісіі Совецкага Кантролю (апублікавана ў друку ад 6 чэрвеня) адзначаецца, што гэта вынаходства, якое мае вялікае народнагаспадарчае значэнне, яшчэ не ўкараняецца ў вытворчасць. Гэта вынаходства павінна быць укаранёна і на прадпрыемствах Белстанкатрэста (дырэктар Левін). Хоць сродкі на набыццё ўстаноўкі прафесара Гевелінга ўжо адпушчаны, але Белстанкатрэст чамусьці затрымлівае ўкараненне ў вытворчасць гэтага каштоўнага вынаходства.

Менскі Цэнтральны дом тэхнікі арганізуе ў бліжэйшы час лекцыю прафесара Гевелінга аб сваім вынаходстве перад шырокай аудыторыяй стахановцаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў. На лекцыі будзе дэманстравацца яго ўстаноўка па павярхоўнай загартоўцы сталі электратокам. У Доме тэхнікі таксама арганізуецца лекцыя вядомага вынаходцы совецкага электраметалізатара (прыбора для пакрыцця металам любых паверхняў) т. Катца.

ПІЛЬНАСЦЬ

Раніцой 6 чэрвеня ў вёсцы Мядзвежына, Менскага прыгараднага сельсавета, возчык, Менхарчгандля Злотнік І. Л. заўважыў невядомага грамадзяніна, які вёў на паводу карову. Прыгледзеўшыся да невядомага, т. Злотнік западозрыў, што карова крадзеная і рашыў затрымаць яго. Каб не выклікаць у злодзея падазрэння, Злотнік пачаў таргавацца з невядомым, які ахвотна згадзіўся прадаць карову за невялікую цану. Пакуль яны таргаваліся, паладспеў член сельсавета Мільгуй І. Ф., і яны затрымалі невядомага, даставіўшы яго ў Прыгараднае аддзяленне міліцыі. Затрыманы аказаўся вядомым злодзеем з Дзержынскага раёна па прозвішчы Белазораў Іван Язэпавіч. Карову ён украў у калгасніцы калгаса «Мілашы», Дзержынскага раёна, Пупко Вольгі. Злодзей Белазораў арыштаван і знаходзіцца пад вартай. Карова вернута папярэпшай.

ЯГАДЫ

На базары ў Менску і іншых гарадах у продажы з'явіліся суніцы. Цёплае надвор'е спрыяе хуткаму выспяванню ягад. Праз адзін—паўтара тыдні пачынаецца масавы збор суніцы.

Віды на ўраджай ягад у гэтым годзе добрыя. Многія калгасы і соўгасы Совецкай Беларусі, якія засеялі вялікія плошчы клубнікі і іншых ягад, чакаюць сабраць багаты ўраджай. У калгасах «Звязда» і «Ўперад», Бібікаўскага сельсавета, Мазырскага раёна, пад ягадныя культуры адведзена 13 гектар. У соўгасе «Жылічы», Кіраўскага раёна, — 28 гектар ягад, «Забалоцце», Аршанскага раёна, — 18 гектар, «Заціішша», Менскага раёна, — 17 гектар, імя Леніна, Смалявіцкага раёна, — 16 гектар.

Усяго ў калгасах ёсць 602 гектары і ў соўгасах 162 гектары клубнікі, малін, агрэста і іншых ягад. У гэтым годзе плошча пад ягадамі ў калгасах і на сядзібах калгаснікаў павялічваецца да 1.300 гектар.

ЗДАРЭННІ

✱ **Напад ваўка.** 1 чэрвеня на хутары Хвойка, Дзякавіцкага сельсавета, Жыткавіцкага раёна, воўк схапіў 5-гадовае дзіця калгасніцы Рагалевіч Параскі. У пагоню за драпежнікам пусціліся калгаснікі. Воўк быў не ў сілах уцячы разам з дзіцём і ў лесе кінуў яго. Аднак дзіця было ўжо нежывое.

П. ДЗЯЛЕНДЗІК.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

Сёння ў кінотэатры «Чырвоная горка» на кожным сеансе дэманструецца экстраны выпуск Белдзяржкінохронікі: **«Адкрыццё XVI З'езда КП(б)Б»**

Белдзярждрамтэатр — гастролі маскоўскага тэатра Чырвонай Арміі — Слава. «Чырвоная горка» — Зварот Максіма. «Пролетарый» — Дэпутат Балтыкі. «Інтернацыянал — Беспасажніца. «Спартак» — Юнасць Максіма. Дзіцячы кінотэатр — Дзяржцырк — вялікае цыркавое прадстаўленне.

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 11 ЧЭРВЕНЯ

16.05 — сімфанічны канцэрт. 17.00 — перадача для дзяцей. 18.30 — завочная партыучоба. 19.30 — песні народаў СССР. 20.15 — перадача на польскай мове. 23.00 — «Апошнія паведамленні». 23.-15 — лёгкая музыка.

ІСПАНСКАЕ МІНІСТЭРСТВА АБАРОНЫ АБ ІНЦЫДЭНЦЕ ЛЯ ВОСТРАВА ІВІСА

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзіденцыя ўрада), 10 чэрвеня (БЕЛТА). Сакратарыят іспанскага міністэрства абароны апублікаваў наступную заяву:

«Германскія афіцыёзныя агенствы і газеты з несумненнай мэтай арабіць уплыў усімі магчымымі спосабамі на міжнародныя колы і адцягнуць грамадскую ўвагу ад варварскага нападу на грамадзянскае насельніцтва Альмерыі — пашыраюць хлуслівыя паведамленні, быццам самалёты, скінуўшыя бомбы ў парту Івіса на крэйсер «Дэйчлянд», знаходзіліся пад кіраваннем рускіх лётчыкаў. Міністэрства абароны заяўляе (і можа даказаць гэта), што ўсе, хто знаходзіўся на двух быстраходных бамбардыроўшчыках, прадпрыняўшых вышэйуказаны палёт, — іспанцы. Камандзір экскадрыллі атрымаў пісьмовы загад падтрымаць нашы асмінцы, якім у тую ноч было даручана прадпрыняць атаку на востраў Івіса, што яны і выканалі. Пры гэтым самалёты павінны былі абмежавацца разведкай. Яны мелі ўказанне атакаваць самім толькі ў тым выпадку, калі фашысцкія судны напалі-б на рэспубліканскія судны, а таксама павінны былі адказаць на любую атаку, аб'ектам якой яны паслужылі-б з мора ці з сушы. Гэты загад быў дакладна выканан».

* * *

ВАЛЕНСІЯ, 10 чэрвеня. (БЕЛТА). Дэкрэтам урада ў Каталоніі ствараецца флатылія для нагляду і абароны іспанскіх суднаў ад нападу падводных лодак мяцежнікаў і інтэрвентаў. Камандаванне флатыліі будзе знаходзіцца ў Барселоне.

НОВАЯ НАРОДНАЯ АРМІЯ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ІСПАНІІ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 9 чэрвеня. (БЕЛТА). Друк прывозіць гутарку, даную міністрам нацыянальнай абароны Іспаніі Прыета прадстаўніку французскай правінцыяльнай газеты «Эндапанданс дэ Пірэне арыенталь». Гаворачы аб рэарганізацыі арміі, Прыета заявіў, што галоўнае цяпер не ў колькасці байцоў.

«Мая задача, — заявіў Прыета, — стварыць народную армію, якая-б прадстаўляла сабой унушальную сілу. Да гэтага часу ў арміі было шмат смелых і гераічных людзей, не меўшых, аднак, неабходнай баявой і тактычнай падрыхтоўкі. Цяпер мы рыхтуем шмат спецыялістаў: лётчыкаў, артылерыстаў, тэхнікаў, сапёраў, падрыўнікоў, радыётэлеграфістаў і т. п. Рыхтуем таксама камандны склад. Дзякуючы інтэнсіўнай рабоце, усе гэтыя кадры ў хуткім часе ўвальюцца ў новую, бліскуча абучаную і маючую выдатны камандны склад народную армію. У бліжэйшы-ж час мы будзем мець тое неабходныя для нашай авіяцыі самалёты і артылерыю».

ДЭЗЕРТЫРСТВА У ЛАГЕРЫ МЯЦЕЖНІКАЎ

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі), 9 чэрвеня. (БЕЛТА). Орган компартыі «Мундо обраро» паведамляе, што на працягу 10 дзён заціішша на цэнтральным фронце. На рэспубліканскія лініі з'явіліся 102 перабежчыкі з лагера мяцежнікаў. 27 мая быў рэкордным днём за мінулы месяц. За гэты дзень па рэспубліканскія лініі з'явіліся 73 перабежчыкі.

Агенцтва Фебус паведамляе, што за май да рэспубліканцаў перайшло звыш 1 тыс. перабежчыкаў.

Газета «Фрэнтэ рохо» піша, што на адным астурыйскім фронце за тры апошнія месяцы да рэспубліканцаў перайшло 1.300 салдат з лагера мяцежнікаў.

* * *

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 9 чэрвеня. (БЕЛТА). Газета «Се суар» паведамляе, што, згодна атрыманых ёю вестак, у горадзе Манакор (востраў Майёрка) паўсталі 300 салдат мяцежнікаў. Бай ў лагеры мяцежнікаў пятнуліся тры дні. Пры падаўленні паўстання мяцежнікі страцілі 150 чалавек забітымі і ранеными. 300 паўстаўшых салдат расстраляны.

ПРАТЭСТ АНГЛІЙСКАГА ЎРАДА

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 9 чэрвеня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, англійскаму паслу ў Іспаніі дана інструкцыя паслаць пратэст уладам іспанскіх мяцежнікаў, у сувязі з выбухам, які адбыўся ад міны на англійскім ваенным судне «Хантэр» каля Альмеры 13 мая.

Англійскі ўрад пакідае за сабой права патрабаваць кампенсацыі за страты ад выбуху. Па неафіцыяльных даных, страты вылічваюцца ў 70 тыс. фунтаў стэрлінгаў.

ФАШЫСЦКАЯ ПРАПАГАНДА У ІСПАНІІ

ВАЛЕНСІЯ, 10 чэрвеня. (БЕЛТА). Генеральнае кіраўніцтва мадрыдскай паліцыі паведамляе, што пры вобыску на мадрыдскай кватэры германскага грамадзяніна Рэдэра, які знаходзіцца зараз у Парыжы, знойдзены дакументы, з якіх зёлаць, што Рэдэр быў назначан германскім урадам кіраўніком аддзела фашысцкай прапаганды ў Іспаніі. Апрача таго, знойдзены фашысцкія кнігі і газеты. Арыштаваны два іспанцы, якіх Рэдэр скарыстаў у якасці сваіх агентаў.

ЗАЯВА ЛЕОНА БЛЮМА

НЬЮ-ЁРК (буйнейшы цэнтр ЗША), 9 чэрвеня. (БЕЛТА). Друк газетнага трэста «Скрыпс-гозард» публікуе гутарку французскага прэм'ера Леона Блюма з рэдактарам замежнага аддзела трэста Сімсам.

Блюм падкрэсліў **непадзельнасць еўрапейскага міру.** Двухбаковыя пагадненні, сказаў ён, не могуць забяспечыць мір. Францыя захоўвае сваю вернасць Лізе нацый і сваім абавязацельствам у Еўропе. Іспанія пралаўжае быць небяспечнейшым пунктам у Еўропе. Надзея на ўдаленне іншаземных добраахвотнікаў з Іспаніі канчаткова яшчэ не пазбавана, але зараз пяжка прадбачаць, як доўга ў Іспаніі працягнецца кровапраліццё.

РЭЖЫМ ШЫБЕНІЦ І ЧАЛАВЕКАНЕНАВІСНІЦТВА

ВАРШАВА (сталіца Польшчы), 9 чэрвеня. (БЕЛТА). Учора закончыўся громкі судовы працэс краўца Хацкелевіча, забіўшага ў мінулым годзе ў Менску-Мазавецкім вахмістра мясцовага ўланскага палка Буяка ў адпомшчэнне за лютыя здзекліўвы адносіны да яго ў мінулым, калі Хацкелевіч адбываў у гэтым уланскім палку вайсковую павіннасць. Забойства Буяка паслужыла, як вядома, повадам да арганізаванага эндэкамі (нацыянал-дэмакратамі) яўрэйскага пагрому ў Менску-Мазавецкім. Суд вынес Хацкелевічу смяротны прыгавор, адхіліўшы акт судова-медыцынскай экспертызы, прызнаўшай Хацкелевіча асобай з абмежаванай адказнасцю за свае дзеянні.

У матывіроўцы прыгавору суд, салідарызуючыся з ярай антысеміцкай пазіцыяй прадстаўніка абвінавачання, заяўляе, што Хацкелевіч «учыніў сваё злачынства не па асабістых матывах», а як быццам з-за нянавісці да Польшчы і польскай арміі, нібыта ўнушонай яму пад уплывам «вядомай часткі яўрэйскага грамадства і друку».

ЯПОНСКІ ПАРЛАМЕНТ ЗБІРАЕЦЦА Ў ЛІПЕНІ

ТОКІО (сталіца Японіі), 9 чэрвеня. (ТАСС). Совет міністраў сёння пастанавіў склікаць надзвычайную сесію парламента 23 ліпеня з тым, каб афіцыяльнае адкрыццё сесіі, на якой будзе сказана тронная прамова імператара, адбылося 25 ліпеня. Прэм'ер Каное, міністр замежных спраў Хірота і міністр фінансаў Кайя выступяць 27 ліпеня.

Адначасова совет міністраў, па словах агенцтва Дамей Пусін, намеціў рад законапраектаў, якія будуць унесены на надзвычайную сесію парламента. Сярод іх—законапраект «аб утварэнні самастойнага міністэрства аховы здароўя» і распрацоўваемы зараз міністэрствам фінансаў законапраект аб «кантролі над здабычай золата».

Першы законапраект, як вядома, уносіцца па патрабаванню ваенных улад (ваенныя ўлады, відавочна, заклапочаны катастрафічным пагаршэннем здароўя моладзі, якая прызываецца ў армію). Другі законапраект, прадугледжваючы прымусовы продаж японскаму банку ўсяго золата, якое здабываецца залатой прамысловасцю, паказвае, што міністэрства фінансаў прадбачыць вялікія пяжкасці ў падтрыманні курса іены (японскай валюты) на цяперашнім узроўні.

АНТЫЯПОНСКАЕ ПАЎСТАННЕ У ПРАВІНЦЫІ ЧАХАР РАЗРАСТАЕЦЦА

ШАНХАЙ (буйнейшы цэнтр Кітая), 9 чэрвеня. (БЕЛТА). Газета «Сіньвеньбао» паведамляе, што антыяпонскае паўстанне ў паўночна-ўсходняй частцы правінцыі Чахар (Унутраная Манголія — частка Кітая) пашырылася таксама і на заходнюю частку правінцыі Жэхэ. Паводле слоў газеты, нядаўна ў раёне Фынін (паўднёва-заходняя частка правінцыі Жэхэ) паўстанцы арганізавалі «армію самаабароны», у якой налічваецца 4 тыс. байцоў. Лянмі атрады «арміі самаабароны» напалі на часці войск Манчжоу-Го ў раёне Хэйхачуань і раззброілі іх. Мясцовае насельніцтва вялікімі групамі далучаецца да паўстанцаў. Некаторыя часці войск Манчжоу-Го, размешчаныя ў Далановы (паўночна-ўсходняя частка правінцыі Чахар), паводле слоў газеты, маюць намер таксама далучыцца да паўстанцаў.

* * *

БЭЙШІН (б. сталіца Кітая), 9 чэрвеня. (БЕЛТА). Газета «Шыцзежыбао», паведамляючы аб стварэнні паўстанцамі ў заходняй частцы правінцыі Жэхэ «арміі самаабароны», указвае, што 3 чэрвеня гэта армія пачала ваенныя дзеянні супроць японска-манчжурскіх войск і заняла рад раёнаў у паветах Гуюань і Даланор (на граніцы правінцый Чахар і Жэхэ). Паўстанцамі раззброена таксама так званая пагранічная паліцыя ў павеце Фынін. Дробныя атрады партызан далучаюцца да «арміі самаабароны».

ХВАЛЯ ЗАБАСТОВАК У ЗША

НЬЮ-ЁРК, 9 чэрвеня. (БЕЛТА). У ЗША ўзмацняецца новая хваля забастовак. Сёння забаставалі рабочыя электрычных станцый у Сагінаў (штат Мічыган), у горадзе Флінце і іншых гарадах з агульнай колькасцю насельніцтва ў 350 тысяч чалавек. У сувязі з гэтым закрыты аўтамабільныя і іншыя прадпрыемствы, на якіх занята звыш 42 тысяч рабочых.

Бастуючыя адхілілі пагадненне, заключанае ўчора віцэ-старшынёй профсаюза аўтамабільных рабочых. Абвясцілі забастоўку звыш 16 тысяч рабочых на аўтамабільных прадпрыемствах ў Дэтройце і Балтыморы, патрабуючы ад прадпрыемстваў выканання пагадненняў. Па-ранейшаму бастуюць 73 тыс. сталеліцейшчыкаў.

СУПРОЦЬ УРАДА ВАИНЫ І ГОЛАДУ

У лютым 1937 года палкоўнік Коп па даручэнню маршала Рыдз-Сміглы абвясціў платформу новай палітычнай партыі фашысцкага тыпу ў Польшчы. 4 месяцы ўжо, як польскі друк узмоцнена папулярызуе гэту платформу. Аднак, папулярызацыя гэтая дала нікчэмныя рэзультаты. Народныя масы Польшчы рашуча выступаюць супроць новай урадавай партыі, створанай Копам.

Зграя пілсудчыкаў ужо не раз прабавала стварыць кіруючую партыю польскага фашызма. Яшчэ ў 1928 годзе быў арганізован «беспартыйны блок супрацоўніцтва з урадам», — свайго роду аб'яднанне раду буржуазных палітычных груповак, падтрымліваючых майскі пераварот Пілсудскага (пераварот у маі 1926 г.). Аднак гэты блок настолькі скампраметаваў сябе перад усёй грамадскасцю, што самі пілсудчыкі вымушаны былі яго ў 1935 годзе распусціць.

Новая кіруючая партыя польскага фашызма названа «лагерам нацыянальнага аб'яднання». Коп стараўся утаіць паўную праемственасць паміж новай партыяй і «беспартыйным блокам».

Кіраўнік віленскай арганізацыі партыі Копа, нейкі Баранскі, у газеце «Слово» прагаварыўся, чаму ўрадаваму лагеру выгодна гэта ўтойваць. «Мы асабліва аспярожны ў адносінах былых членаў «беспартыйнага блока». «Блок» настолькі непапулярны ў грамаллстве, што незычлівыя адносіны пашыраюцца і на тых, хто да яго належаў».

Але як-бы пілсудчыкі ні ўтойвалі гэтай праемственасці, як-бы ні вылучаліся кадры для новай фашысцкай партыі, шырокую грамадскасць абмануць не ўдалося.

САКАЛОЎСКІ

* * *

Народныя масы правільна распазнілі, што новая партыя — гэта толькі перамена шыльды, пад якою хаваецца зграя пілсудчыкаў, якія за 11 год прабывання ва ўладзе прывялі народныя масы да галечы і разарэння.

Новая партыя павінна была, паводле планаў яе арганізатараў, расшырыць уплыў кіруючай клікі, адкалоць і прыцягнуць да сябе групы з апазіцыйнага лагера. Разлічваючы прыцягнуць антысеміцкія элементы з нацыянал-дэмакратычнай апазіцыі — другой фашысцкай партыі ў Польшчы,—палкоўнік Коп агаласіў адкрыта антысеміцкія лозунгі. Не выключана, што агентам Копа, якія вядуць падрыўную работу ў апазіцыйных партыях, удалося каго-небудзь пераманіць у «лагер нацыянальнага аб'яднання». У крайнім выпадку, для эфекту ў карысць «нацыянальнага аб'яднання» выкажацца той ці іншы пілсудчык, які займаецца дыверсіяй унутры апазіцыйных партый. Падобны факт меў ужо месца, калі ў Дамброўскім раёне кіраўніком партыі Копа быў назначан дзеяч нацыянал-дэмакратычнай апазіцыі.

Прыцягнуць-жа шырокія слаі дробнай буржуазіі, якая ідзе за нацыянал-дэмакратыяй, Копу не ўдалося. Урад вымушан быў за апазіцыйныя выступленні нават распусціць рад нацыянал-дэмакратычных студэнцкіх арганізацый.

Да лагера Копа не далучыліся асобныя арганізацыі, створаныя яшчэ Пілсудскім. Калі быў арганізован «беспартыйны блок», пілсудчыкі шляхам дыверсіі адкалолі пэлую групу ад ППС і профсаюзаў. Адзін з кіраўнікоў гэтай групы—Марачэўскі — у выніку каля 10 год быў кіраўніком фашысцкіх профсаюзаў у Польшчы.

А цяпер, калі Коп захапіў паўтарыць улюбёныя металы дыверсіі ўнутры апазіцыі, нават цэнтральнае праўленне фашысцкіх профсаюзаў, на чале якога стаіць Марачэўскі, вымушана было пад напорам низоў выказацца супроць дэкларацыі Копа.

Адмоўную пазіцыю заняла і сялянская партыя «Стронніцтво людова».

У рашэнні кіраўніцтва партыі гаворыцца:

«Паколькі дэкларацыя палкоўніка Коца не толькі не ўлічвае гэтых патрабаванняў (гаворка ідзе аб патрабаваннях дэмакратычных праў і змены знешняй палітыкі Польшчы. — **Заўвага аўтара**), але і ўсіх істотных праў і інтарэсаў народу, сялянская партыя павінна прапіпаставіць сябе акцыі, прадпрынятай палкоўнікам Копам».

Рабочыя, аб'яднаныя ППС і класавымі профсаюзамі, яшчэ больш рашуча выступілі супроць новай фашысцкай партыі.

Палкоўнік Коп у якасці асноўнага лозунга высоўваў «кансалідацыю краіны», «умацаванне абароназдольнасці Польшчы». Гэтым ён прабаваў заігрываць на нацыяналістычных пачуццях некаторай часткі насельніцтва.

Аднак, шырокія народныя масы ведаюць добра бачаць, што іменна цяперашнія кіраўнікі з'яўляюцца найбольш небяспечнымі ворагамі нацыянальнай незалежнасці Польшчы. Ні хто іншы, як сёнешні саюзнік і друг міністра замежных спраў Бека Гітлер высоўвае сваю моладзь на батэхізісе «Мая барацьба», дзе аспоўнай лініяй Германіі ў адносінах да Польшчы з'яўляецца: захват польскага каридора, Пазнані, Верхняй Сілезіі і Данцыга. Наперакор жыццёвым інтарэсам краіны, Бек і К° падпарадкоўваюць інтарэсы Польшчы патрабаванням германскага фашызма. Народныя масы ведаюць, што заява польскага прадстаўніка ў Лізе нацый аб недапушчэнні на пасяджэнне Совета Лігі дэлегата Абісініі, спробы раскалоць Малую Антанту — служаць справе вайны, а не ўмацаванню міру.

Таму, калі польскі ўрад з усіх сіл стараецца дапамагчы германскім і італьянскім інтэрвентам у закабаленні Іспаніі і знішчэнні іспанскага народу, народныя масы Польшчы спяшаюцца з дапамогай для рэспубліканскай Іспаніі. Не гледзячы на паліцэйскія праследванні, рабочыя арганізавалі рад дэманстрацый салідарнасці з іспанскім народам. Калі лозінскія рабочыя даведаліся, што фабрыканты хочуць выконваць заказ для арміі генерала Франко, яны не замарудзілі адказаць на гэта забастоўкай пратэсту. У краіне прахозяць грашовыя зборы ў карысць працоўных рэспубліканскай Іспаніі. Калі польскі міністр замежных спраў Бек раз'язджаў па Еўропе і шукаў саюзнікаў для Гітлера, а ў краіне ішла шырокая агітацыя за новую фашысцкую партыю, створаную палкоўнікам Копам, на многіх мітынгах раздаваўся лозунг: «У Бярозу Бека!». («Бяроза Картуская» — вядомы канцлагер, дзе пакутуюць сотні антыфашыстаў).

Коп абяцаў расшырыць землекарыстанне сялян. Для працоўных сялян гэтыя дэмагагічныя абяцанні — не навіна. Яны іх чулі ад лідэраў «беспартыйнага блока» пасля фашысцкага перавароту 1926 года і яны пераканаліся, што за гэтымі абяцаннямі наследвала насаджэнне каланістаў у Заходняй Беларусі і Украіне, умацаванне кулакоў і яшчэ большае разарэнне беднаты і сераднякоў. Каб не палохаць памешчыка скарачэннем яго землекарыстання на карысць кулака, Коп тут-жа агаварыўся, што за памешчыкамі поўнасцю гарантуецца захаванне іх інтарэсаў.

Вылатны дзеяч кіруючага лагера—Жэлігоўскі—вымушан быў прызнаць, што калі селянін атрымлівае 40 грошаў дапамогі або ільгот, то памешчык атрымлівае 19 злотых. Але і гэтыя 40 грошаў, як правіла, атрымліваюць заможна-кулацкія слаі вёскі. Для шматмільённага малазямельнага і бязямельнага насельніцтва вёскі асталіся тыя-ж выпрабаваныя метады палатковага грабяжу і разарэння.

Не паскупіўся Коп і на абяцанні і пасулы і па адрасу рабочага класа. «Ніякая праца не зневажае», «Грамадская структура Польшчы апіраецца на шырокія масы рабочых і сялян» і т. п. Гэтымі пышнымі фразамі пілсудчыкі хацелі прыцягнуць на свой бок частку рабочых, абманутых фашысцкай дэмагогіяй.

Сапраўднасць-жа такая, што становішча рабочага класа ўсё больш і больш пагаршаецца. У разе капіталістычных краін у рэзультаце некаторага гаспадарчага ажыўлення, хаця і не значна, але скарацілася беспрацоўе. Польшча ні ў якім разе не можа аднесці сябе да гэтай катэгорыі. Нядаўна орган ППС «Роботнік» паведамляў, што муніцыпалітэт (гарадское самакіраўніцтва) г. Ярослаўля, Львоўскага ваяводства, яшчэ ў мінулым годзе меў магчымасць забяспечыць працай на летніх грамадскіх працах 300 чал. У гэтым годзе ён пазбаўлен усякіх сродкаў на правядзенне такіх прац.

Прадстаўнікі кіруючага лагера ў Польшчы не раз дэкламавалі, што комунізм і класавая барацьба «чужы духу польскага народу». Аб «выгнанні класавай барацьбы з Польшчы» дэкламуе і палкоўнік Коп. Масавыя збіванні, турмы, канцэнтрацыйныя лагеры, расстрэлы і шыбеніцы для рабочых і сялян, разгром пролетарскіх арганізацый — лепшая ілюстрацыя да гэтых пышных фраз зграі пілсудчыкаў. Што тычыцца шырокіх працоўных мас Польшчы, то яны добра ведаюць, што такую школу гэтай барацьбы.

Рабочы клас Польшчы і зараз на дэкларацыю новай фашысцкай партыі адказвае хваляй эканамічных і палітычных стачак. Як толькі ўрад распусціў муніцыпалітэт г. Лодзі, на выбарах якога большасць атрымалі рабочыя партыі, — рабочыя зараз-жа арганізавалі палітычную забастоўку. Велізарнае значэнне мае ўсеагульная забастоўка тэкстыльшчыкаў г. Беластока. У гэтай забастоўцы яшчэ раз выявілася вялікая салідарнасць рабочага класа. З іншых гарадоў і мястэчак Заходняй Беларусі рабочыя пасылалі запамогу бастуючым. Сяляне, якія не бачаць гадамі солі, для якіх мыла і запалкі з'яўляюцца раскошай, збіраюць прадукты ў дапамогу бастуючым і на падводах за дзесяткі кілометраў вязуць у горад.

Дапамога для змагаючагася пролетарыята, якая збіраецца ў галодным вёсны гэта — яркі паказальнік мацнеючага саюза рабочых і сялян. Усё больш і больш шырокія сялянскія масы ў асобе пролетарыята бачаць свайго адзінага вернага саюзніка.

У барацьбе за хлеб, свабоду і мір народныя масы Польшчы ідуць па шляху накансалідацыі сваіх сіл. Народны антыфашысцкі дэмакратычны фронт барацьбы расце і мацнее, наперакор усім перашкодам, якія ставяць фашысцкія, рэакцыйныя элементы Польшчы. На чале адзінага народнага фронта стаіць компартыя Польшчы, якая рыхтуе, накапляе сілы для рашучага рэвалюцыйнага штурму.

Уп. Галоўлітбела № К—2125.

Друкарня газеты «Звязды». Менск, Совецкая, 63.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

К., К., С.